

ЯК З'ЕХАЦЬ З ГОРКІ? ЗДАРОВЫМ І... ЖЫВЫМ 5

ДАПАМАГАЕМ РАЗАМ



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

11 СТУДЗЕНЯ 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 6 (28873)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TVПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Вольга ПРУДНІКАВА, намеснік міністра энергетыкі:**

*«Калі гаварыць пра пастаўкі «зялёнай» электраэнергіі на экспарт у сённяшніх умовах, то не ўсё будуецца толькі на нашым жаданні. Думаю, што магчымасць паставак такой электраэнергіі на экспарт — не міф, у перспектыве гэта рэальна. Але павінен быць інстытут зялёных сертыфікатаў з выдачай сертыфіката еўрапейскага ўзору. Мы да гэтага пытання падступаліся некалькі гадоў, таму і працягнем такую работу. Электраэнергія ад установак аднаўляльных крыніц энергіі дакладна фіксуецца прыборным улікам, і пры наяўнасці гэтага інстытута сертыфікатаў ёю можна гандляваць. Але не будзем забываць пра эканоміку паставак, сёння на еўрапейскім аптовым рынку цэны даволі нізкія».*

# Лепельская званарка



Жыхарка Лепеля, староста праваслаўнага прыхода храма Праабражэння Гасподняга Лідзія Сінякова, ужо пяць гадоў выконвае абавязкі царкоўнага званара. У кожнае набажэнства — і ў святы, і ў будні, жанчына спяшаецца ў храм, каб абудзіць наваколле. Яе званіца ва ўсіх навідавоку — над каванай брамай на ўездзе ў царкоўны двор. Лідзія Васілеўна бярэ ў рукі тонкія вяровачкі і з зямлі прыводзіць у рух языкі-малаточкі, ад якіх і пачынае спяваць ансамбль з пяці званоў.

— На званара я нідзе не вучылася. Настаяцель храма паказаў некалькі прыёмаў звону, даў пачытаць літаратуру, а ўсё астатняе — справа тэхнікі і натхненне душы, — кажа лепельская званарка.

Калі Лідзія Васілеўна пачынае званіць, вернікі становяцца пад арку брамы, каб адчуць непаўторныя малінавыя гукі, асабліва ў святочныя калядныя дні.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

• XXVI Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш пройдзе 6—10 лютага ў комплексе па праспекце Пераможцаў, 14.



**• У Беларусі плануецца забараніць блізкім сваякам працаваць разам у арганізацыях са статутным фондам дзяржаўнай уласнасці 50 % і больш.**

• У Расіі могуць забараніць школьнікам прыносіць ежу з дому.

**• 29-гадовы жыхар Оршы прайграў у казіно пазычаныя ў знаёмых 54 тысячы долараў.**

ISSN 1990 - 763X

Занятасць

# У выйгрышы інтэрнэт-маркетолагі і электраманцёры




**Ці чакаць росту заробкаў сёлета? У якіх сферах вакансій будзе хапаць, а дзе з пошукам рабочага месца давядзецца паваждацца? І наогул, ці спрыяльны цяпер час мяняць работу? «Звязда» папрасіла экспертаў падзяліцца прагнозамі на бягучы год.**

## Пункт раўнавагі

Па афіцыйнай статыстыцы, за мінулы год павялічылася колькасць вакансій: у снежні 2018-га наймальнікамі было заяўлена на 41 працэнт свабодных рабочых месцаў больш, чым год таму. Цяпер у агульнарэспубліканскай базе налічваецца 78 тысяч прапаноў.

— Думаю, такі попыт на рабочую сілу захаваецца і сёлета, — дзеліцца **начальнік упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алег ТОКУН.** — Колькасць вакансій значна расці не будзе. Сітуацыя дасягнула пункта раўнавагі.

СТАР. 4

Разумныя грошы

# ЗБЕРАЖЭННЯМІ ТРЭБА КІРАВАЦЬ

## Інакш страціце выгаду

**Як толькі ў нас з'яўляюцца лішнія грошы, то адразу ўзнікае пытанне, куды іх укласці, каб яны прынеслі нейкі дадатковы прыбытак. У фінансістаў наконт гэтага прапаноў хапае. Аналітыкі ўпэўненыя, што грошы павінны працаваць нават тады, калі поспехі ў эканоміцы не такія відавочныя... Зберажэннямі трэба проста правільна кіраваць. Як гэта рабіць — тут кожны выбірае свой алгарытм.**

## ЛЕПШ УСЁ-ТАКІ БЕЗАДЗЫЎНЫ...

Варыянтаў мноства, але яны залежаць ад сумы вашых накапленняў. Самы першы, які прыходзіць у галаву большасці і даступны ўсім, — адкрыць дэпазіт. Але не ўсё так проста, бо тэндэнцыі змяняюцца. Давайце разбярэмся, якія бываюць банкаўскія ўклады і колькі можна на гэтым зарабіць.

Уклады дзеляцца на дзве асноўныя катэгорыі — адзыўныя і безадзыўныя. Адзыўны дэпазіт афармляецца на пэўны тэрмін, але пры жаданні вы можаце ў любы момант забраць свае грошы — цалкам або часткова. Ужо за саму магчымасць у любы час пакарыстацца сваімі грашыма кліент банка расплачваецца паніжанымі працэнтамі. Самы выгадны адзыўны дэпазіт на пяць месяцаў прадугледжвае 7—8 % гадавых. Гэта дзесьці на 2—2,5 % менш, чым па стаўцы безадзыўнага ўкладу.

Калі вы здымаеце грошы датэрмінова, то працэнты налічваюцца і выплачваюцца за фактычны час захоўвання сродкаў па стаўцы, ніжэйшай за асноўную. Зараз умовы датэрміновага скасавання вельмі жорсткія. Дапусцім, ваш дэпазіт на пяць месяцаў, а грошы вы забралі ўжо праз месяц. У гэтым выпадку вам налічаць ўсяго адзін працэнт даходу. Калі зберажэнні праляжаць два месяцы — атрымаеце 3 %, тры месяцы — 5 %, чатыры месяцы — 6 %.

СТАР. 4

# НА АСНОВЕ ПАРЫТЭТУ

## Любы саюз дзяржаў можа будавацца толькі на роўных умовах

**Аб гэтым заявіў Аляксандр Лукашэнка падчас нарады аб сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі ў 2019 годзе і падыходах да далейшага развіцця інтэграцыйных кірункаў.**



Фота БелТА.

«Я мяркую, няма неабходнасці сёння казаць пра тое, што святы скончыліся і трэба інтэнсіўна ўключацца ў работу. Год будзе нялёгкі», — пачаў размову беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што падчас нарады ён хацеў бы абмеркаваць пытанні эканамічнага і грамадска-палітычнага развіцця нашай краіны ў 2019 годзе. «Шмат пра гэта гаворыцца. І пра тое, што гэта перадвыбарчы год, яно сапраўды так. Тое, што ў нас дастаткова пытанняў, якія трэба вырашаць лепш, чым яны вырашаюцца ў цяперашні час. І мы ведаем, як гэта рабіць», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Ён праінфармаваў прысутных аб апошніх перагаворах з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным і звярнуў увагу, што сёння існуюць пытанні, звязаныя з нашым асноўным партнёрам — Расіяй, а таксама ЕАЭС у цэлым. Маюцца пытанні і ў ваенна-палітычным блоку — АДКБ.

«Што датычыцца Расійскай Федэрацыі, вы ведаеце, што ў нас практычна ўсе праблемы эканамічнага характару вырашаны ў больш-менш прымальным варыянце, — заявіў ён, звяртаючыся да ўдзельнікаў нарады. — Ёсць пытанні, невялікія, пра якія мы заўсёды расіянам казалі, — гэта пастаўкі нашай сельскагаспадарчай прадукцыі, харчовай і іншай на рынкі Расійскай Федэрацыі. Але яны не носяць крытычнага характару, і мы з Прэзідэнтам Расіі дамовіліся, што гэтыя ганебныя пытанні трэба здымаць, каб яны больш ніколі не стаялі на парадку дня нашых перагавораў, і не толькі на вышэйшым узроўні».

Аляксандр Лукашэнка нагадаў пра пытанні, звязаныя з дазволам на аўтаперавозкі. На яго думку, у гэтай сферы Беларусь пастаўлена ў горшыя ўмовы, чым Польшча і Літва. Шмат «крыку і гвалту» з нагоды палітыкі гэтых дзяржаў у дачыненні да Расіі, шмат размоў аб Саюзнай дзяржаве і ЕАЭС, але пры гэтым элементарныя пытанні не вырашаюцца, у сувязі з чым прэзідэнты Беларусі і Расіі палічылі іх выключна нявартымі для абмеркавання кіраўнікамі дзяржаў.

«Іх, вядома, трэба вырашаць, і вырашаць іх можна элементарна», — заявіў Прэзідэнт.

### У аснове — раўнапраўе

Што датычыцца вялікіх і адчувальных пытанняў у адносінах з Расіяй, Аляксандр Лукашэнка расказаў, што сёння ідзе шмат размоў пра аб'яднанне двух дзяржаў. Акрамя таго, шмат пытанняў з'явілася і ў сувязі з царквой на Украіне аб аўтакефаліі беларускай царквы.

«Я называю гэтыя пытанні вельмі дурнымі, прыцягнутымі за вушы для абмеркавання ў нашым грамадстве. Гаворкі пра аб'яднанне быць не можа, — падкрэсліў беларускі лідар. — І мы з Прэзідэнтам Расіі адназначна, аднагалосна вызначылі, што сёння на парадку дня такога пытання няма — аб аб'яднанні».

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў свой час бакі ішлі строга па Дагаворы аб саюзе Беларусі і Расіі, павінны былі прыняць канстытуцыйны акт, дзе ўсё мусіла быць прапісана: і органы кіравання, і адзіная валюта, і гэтак далей. «Расія адмовілася ў свой час ісці гэтым шляхам. Я гэта нагадаў Прэзідэнту Расіі, ён сказаў: так, так і было», — адзначыў Лукашэнка.

І тут паўстае пытанне: што рабіць з саюзным дагаворам? На думку Прэзідэнта Беларусі, трэба садзіцца за стол і глядзець, што мы разам можам сёння, згодна з дакументам вырашыць. На што бакі разам, без усякага ціску, могуць пайсці.

«Толькі на раўнапраўнай аснове мы можам фарміраваць саюз Беларусі і Расіі», — падкрэсліў ён.

Гэта звязана з тым, што гэта фундаментальныя прынцыпы пабудовы любога саюза. Прэзідэнт зноў звярнуў увагу: няма раўнапраўнай асновы — няма саюза. У іншым выпадку — гэта анексія і інкарпарацыя. Акрамя таго, на стварэнне аб'яднання павінна быць воля двух народаў. «Мы ўвесь час, фарміруючы гэты саюз, павінны азірацца на меркаванне нашых людзей», — дадаў беларускі лідар.

У сувязі з гэтым па многіх прычынах аб аб'яднанні дзвюх дзяржаў сёння гаворкі не ідзе, рэзюмаваў Прэзідэнт. Ён дадаў, што на гэты крок пайсці не можа і сама Расія, пра што беларускаму лідару сказаў Уладзімір Пуцін. Такой магчымасці ў Расіі няма, улічваючы настуцтвы.

«Таму трэба супакоіцца і спыніць гэтыя размовы, што хтосьці кагосьці нахіліў або нахіляе. Тут ніхто нікога не схіліць, нават моцны слабога», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

### Непрымання — няма

Далей кіраўнік дзяржавы выказаўся наконт эканамічных праблем нашай краіны і падатковага манеўру Расіі.

«Ніякага непрымання па пытанні кампенсацыі не было. Не было, што вось, Расія кажа не, мы не будзем кампенсаваць ваша пагаршэнне сітуацыі, страты і гэтак далей, — расказаў беларускі лідар. — Больш за тое, Прэзідэнт Расіі прапанаваў і ў новым годзе і адзін на адзін, і ў складах рабочых груп працягнуць перагаворы па гэтым пытанні, выпрацаваць прымальныя рашэнні».

На думку Прэзідэнта, гэта пытанне варта было вырашыць да 1 студзеня, аднак ніякай катастрофы на сённяшні дзень няма, бо страты ад манеўру ў Беларусі сёлета складуць «смешную суму» — калі кошт нафты за барэль будзе каля 70 долараў, то гэтая сума складзе прыкладна 400 мільёнаў долараў. «Гэта не катастрофа, але мы на гэта пайсці не можам, таму што з 2015 года, калі быў уведзены гэты падатковы манеўр, мы ўжо страцілі 3,6 мільярда долараў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

А да заканчэння гэтага манеўру Беларусь страціць 10,6 мільярда долараў. Беларускі лідар звярнуў увагу, маўляў, гэта супярэчыць духу і «літары» ўсіх узаемных дамоўленасцяў, у тым ліку ў рамках ЕАЭС. Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў Расіі часта гучыць пазіцыя, нібыта ў рамках падатковага манеўру няма абавязацельстваў па кампенсацыі, гэта не прапісана ў саюзных дагаворах. Тут Аляксандр Лукашэнка задаў прамое пытанне: «Дык што, мы падпісалі гэтыя дагаворы — аб Саюзнай дзяржаве, ЕАЭС — і разлічвалі на пастаяннае пагаршэнне эканамічнай сітуацыі ў сувязі з нейкімі ўнутранымі дзеяннямі Расійскай Федэрацыі? Не. Мы разлічвалі на лепшае, і гэта ўсюды запісана».

Што да самога манеўру, то Прэзідэнт Беларусі заявіў расійскаму калегу, што падчас падпісання дакументаў і гаворкі не было пра падобныя здарэнні. Пры гэтым была агульная фармулёўка аб недапушчэнні пагаршэння двухбаковых адносін, у тым ліку сярод удзельнікаў ЕАЭС.

Беларускі лідар нагадаў, што ў Расіі ішлі перагаворы на ўзроўні ўрадавых экспертаў, былі выпрацаваны кампенсацыі Беларусі, былі вызначаныя крыніцы — пра ўсё гэта было абвешчана публічна, аднак потым раптам расійскі бок спыніў перагаворы, не адмаўляючы самі кампенсацыі, і абумовіў гэта паглыбленнем інтэграцыйных працэсаў. Прэзідэнт падкрэсліў: што гэта за працэсы, у расіян адказу няма. Аднак было вырашана, што гэтае пытанне павінна вырашацца з дапамогай сумесных груп.

«Мы не адмаўляемся ад гэтых перагавораў, яе (беларускую групу. — **«Зв.»**) узначаліць міністр эканомікі Дзмітрый Крутой. Я абсалютна падтрымліваю прапанову, што там павінны быць найвышэйшага ўзроўню службовыя асобы, не толькі спецыялісты», — адзначыў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы дадаў, што перамовы павінны весціся па комплексе пытанняў, якія назначаны ў саюзным дагаворы. На першае месца — гэта стала прапановай Уладзіміра Пуціна — неабходна паставіць фінансава-эканамічныя пытанні.

Дарэчы, літаральна некалькі гадоў таму па гэтых аспектах ужо былі прынятыя рашэнні. «Проста ўрад Расіі пра гэта забыўся, інфармуючы Прэзідэнта Расіі. Але раз ён ставіць гэтыя пытанні зноў — чаго мы будзем адмаўляцца ад іх абмеркавання?» — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Ён зноў падкрэсліў: пакуль будуць ісці гэтыя перамовы і не вырашаца тыя пытанні, якія «ляжаць на паверхні беларуска-расійскіх адносін», тое, што Беларусь губляе з 1 студзеня бягучага года, супярэчыць усім дамоўленасцям, і мы несці страты да ўзроўню мінулага года не можам. «Таму ўсе страты павінны быць кампенсаваны па тых ці іншых кірунках супрацоўніцтва з Расійскай Федэрацыяй, — заявіў беларускі лідар. — Я гэта і Прэзідэнту сказаў, як бы гэта ні балюча і ні сумна было, і паўтараю гэта публічна, і даводжу да вашага ведама як даручэнне Прэзідэнта Беларусі. Вы (удзельнікі нарады. — **«Зв.»**) яго павінны выканаць бездакорна і з дакладнасцю. Мы нічога не можам страціць».

### А варыянты ёсць

«Прагноз і бюджэт на 2019 год сфарміраваны з улікам падатковага манеўру ў Расійскай Федэрацыі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

На думку беларускага лідара, яго дзеянне не абмяжоўваецца адным годам і неабходна мець надзейныя крыніцы, якія будуць кампенсаваць гэты негатыўны ўплыў ужо сёння. «Як і за кошт чаго будзем кампенсаваць страты для бюджэту і нашых нафтаперапрацоўчых заводаў? Гэта пытанне, якое мы сёння таксама павінны абмеркаваць. Але хачу папярэдзіць: аб такіх рашэннях, як перакладанне гэтых праблем на плечы нашых людзей, беларусаў, нават не думайце», — падкрэсліў ён.

Беларусь не такая багатая, пагаршаць становішча беларусаў недазвальна, лічыць Аляксандр Лукашэнка. Беларускі лідар зноў падкрэсліў: насельніцтва не павінна адчуць на сабе ніякага дадатковага цяжару.

У сувязі з гэтым ён папрасіў удзельнікаў нарады выкласці комплексную ацэнку сярэднетэрміновага эканамічнага росту, стану бюджэту, узроўняў інфляцыі і золатавалютных рэзерваў ва ўмовах падатковага манеўру, гэта значыць выхаду на сусветную цану на нафту. «І які тут план ва ўрада існуе?» — пацікавіўся Прэзідэнт.

Па словах кіраўніка дзяржавы, ён не павінен гіпербалізаваць гэтую праблему, паколькі даўно пастаўлена задача скончыць мадэрнізацыю нафтаперапрацоўчых заводаў, каб можна было купляць нафту не толькі ў Расіі, перапрацоўваць і прадаваць. Сёлета мадэрнізацыя НПЗ у асноўным скончыцца, падкрэсліў ён.

Яшчэ Аляксандр Лукашэнка нагадаў пра іншую пастаўленую раней задачу: адкрыць альтэрнатыўную пастаўку нафты праз прыбалтыйскія парты. Закупляць нафту, перапрацоўваць яе на Наваполацкім НПЗ і забяспечваць балтыйскія рэспублікі. На думку беларускага лідара, гэта будзе для іх жа танней.

«Таму не трэба лічыць, што гэта катастрофа. Калі абярэ кіраўніцтва Расіі такі кірунак руху і страту адзінага саюзніка на заходнім напрамку — ну, гэта іх выбар. Мы ж іх прымусіць не можам», — канстатаваў ён.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

**У тэму**

**Па выніках нарады ў кіраўніка дзяржавы некаторыя ўдзельнікі пагутарылі з журналістамі.**

**Міністр эканомікі Дзмітрый КРУТОЙ:**

— Улічваючы канікулы ў Расійскай Федэрацыі, сумесна з расіянамі рабочая група пакуль не збіралася ў шырокім складзе. З боку Расіі і з нашага боку пакуль толькі фармалізаваны склады гэтых рабочых груп. Эксперты па адпаведных кірунках зараз фарміруюць парадак дня будучых перагавораў, праводзіцца аналіз усёй дагаворнай базы Саюзнай дзяржавы, ЕАЭС, двухбаковых фарматаў, якія ў нас існуюць па асобных галінах і ведамствах. Таму ўвесь гэты масіў магчымых праблемных пытанняў да абмеркавання цяпер фарміруецца і пакуль ідзе экспертная адпрацоўка.

Першае пасяджэнне яшчэ не плануецца, улічваючы, што расійскія калегі толькі выйшлі са сваіх навагодніх канікул. Мы з імі гэтую тэму яшчэ не абмяркоўвалі.

Пазіцыя беларускага боку будзе фарміравацца, зразумела, у ходзе перагавораў, таму што вузкасектаральныя пытанні, якія трэба ў пачатку абмеркаваць на ўзроўні экспертаў, а потым ужо даносіць урадам і кіраўнікам дзяржаў.

Ніякіх глабальных разыходжанняў мы на сённяшні дзень не бачым, проста шэраг праблем сапраўды вырашаецца ў такім перманентным рэжыме, і дзесьці па нейкіх аспектах не хапала, напэўна, волі бакоў — сесці і дамовіцца канчаткова.

Гэтыя групы — чарговы шанц усё ж такі гэтыя шматгадовыя праблемы вырашыць.

**Старшыня Беларускага дзяржаўнага канцэрна па нафце і хіміі Андрэй РЫБАКОЎ:**

— Наступіў 2019 год. З пункту гледжання нафтавай галіны — гэта чарговы год падатковага манеўру. Яшчэ раз паўтаруся, што гэта не ў навіну, ён пачаты з 2015 года. Адзінае адрозненне ад папярэдніх гадоў — гэта кампенсацыя сваім нафтаперапрацоўшчыкам Расійскай Федэрацыяй падатковага манеўру.

Сёння былі абмеркаваны кампенсацыйныя механізмы для нафтаперапрацоўкі ў Беларусі. Гэта самы шырокі спектр магчымасцяў, якія трэба будзе ў самы бліжэйшы час адпрацаваць, пакласці эканамічныя і юрыдычныя разлікі на паперу.

Пралік як крыніц пастаўкі, так і спосабаў пастаўкі нафты вядзецца на пастаяннай аснове. Гэта розныя напрамкі. На сённяшні дзень найбольш прэміяльная (але з году ў год яна будзе губляць гэтую прэміяльнасць і прыходзіць да сусветнай цаны) — гэта, вядома, расійская нафта.

— *З'явілася інфармацыя, што Расія ў якасці аднаго з варыянтаў кампенсацыі разглядае куплю нафтаперапрацоўчых заводаў Беларусі. Ці сапраўды гэта так?*

— Афіцыйнай інфармацыі не паступала, таму каментаваць якія-небудзь выказванні не мае сэнсу. Будзе афіцыйная інфармацыя, афіцыйная прапанова — тады будзе афіцыйны каментарый.

# ЦУД НА КАЛЯДЫ

## Пра што гавораць на «Нябёсах»

**Любоў, дабрыня і міласэрнасць. Такі лейтматыў V Міжнароднага каляднага фестывалю батлеечных і лялечных тэатраў «Нябёсы», што адкрыўся ўчора ў адукацыйным цэнтры сталічнага Свята-Елісавецінскага манастыра. Яго госці і ўдзельнікі — тэатральныя калектывы з розных краін свету, гледачы — дзеці і дарослыя, якія захавалі цёплае святло дзяцінства ўнутры. А да тых, хто ў сілу важкіх прычын не можа прыехаць на фестываль, акцёры, вясёлыя клоўны і лялечныя персанажы, нават тыя, хто не ўдзельнічае ў конкурснай праграме, прыедуць самі — у шпіталі, інтэрнаты, дамы састарэлых — і прывязуць разам з казачнымі спектаклямі адчуванне свята...**



**Што агульнага паміж дзяўчынкай Аняй і фестывалем «Нябёсы»? Ім абодвум, расказвае мастацкі кіраўнік фэсту Аляксандр ЖДАНОВІЧ, споўнілася 5 гадоў.**

З 10 да 13 студзеня свае пастаноўкі на суд журы і публікі прадстаўляюць тэатры з пяці краін — Беларусі, Расіі, Украіны, Эстоніі і Літвы. З беларускага боку, у прыватнасці, выступаюць мінскі тэатр лялек «Дзіва», дзіцячы драматычны гурток «Жаронцы» з Ракаўскага цэнтра народнай творчасці і сямейны тэатр Аляксандра і Ларысы Быцко з вёскі Стойлы, што на Брэстчыне, — гэта творчая сям'я ўдзельнічае ў конкурсе ўжо не першы год і прывезла сёлета спектакль «Калядкі на Палессі» на заходнепалескім дыялекце. Таксама ў праграме — літаратурныя гасцёўні і творчыя сустрэчы, майстар-класы па беларускіх танцах і гульнях, саломапляценні, выраб калядных анёлаў і мноства забаў.

Агулам арганізатары атрымалі сёлета 40 заявак ад ахвотных прадставіць сваё бачанне батлеечных традыцый і лялечнага мастацтва — былі сярод прэтэндэнтаў прадстаўнікі Фінляндыі, Італіі, Іспаніі, Вялікабрытаніі, Ізраіля. «Але мы не гонімся за колькасцю, — падкрэслівае **мастацкі кіраўнік фестывалю «Нябёсы», акцёр тэатра і кіно Аляксандр ЖДАНОВІЧ**, — хочацца гаварыць не пра лічбы, шырыню геаграфіі і іншыя дасягненні, а пра тое, што фестываль нясе асаблівую атмасферу дабрыні, радасці, адчуванне свята Раства Хрыстовага, якое хочацца падзяліць з іншымі, бо самая галоўная каштоўнасць у жыцці — стасункі паміж людзьмі. Наша ідэя ў тым, каб з дапамогай маленькіх лялек прайсці вялікі шлях да Бога і ўславіць яго нараджэнне».



**Ірына ВІНАГРАДАВА і лялька Фелікс прывезлі вітанні з Германіі.**

Здавалася б, сюжэты батлеечных пастановак маюць дакладна акрэсленыя рамкі — строгія, нават кананічныя, якія не пакідаюць шмат месца для творчай фантазіі. Тым не менш удзельнікі год ад году знаходзяць новыя ракурсы ў класічнай тэме, адзначае нязменны **член журы фестывалю тэатразнаўца Кацярына ЯРОМІНА, малодшы навуковы супрацоўнік аддзела тэатральнага мастацтва Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі**: «Кожны спектакль па-свойму адметны, цікавы па мастацкім рашэнні, нават унікальны — і разам з тым усе яны аб'яднаныя агульнай ідэяй аб тым, як важна захаваць у сваім сэрцы веру і дабрыню, любоў да людзей. І незалежна ад таго, на якой мове ідзе спектакль — рускай, беларускай ці ўкраінскай, як было летась, галоўнае тое, што ўсе яны на мове мастацтва даносяць да гледачоў найважнейшыя духоўныя каштоўнасці».

«Здавалася б, сёння батлейка — такі анахранізм, вельмі далёкі ад нас, але выявілася, што ў тых ці іншых вёсках знаходзяцца людзі, якія не ведаючы законаў і канонаў батлейкі, спасцігаюць іх самі», — дадае яшчэ адна ўдзельніца судзейскай калегіі, **дацэнт кафедры эстрады Універсітэта культуры і мастацтваў, выкладчык культуры маўлення Дзіна ТЫЦЮК.**

Сёлета ж «Нябёсы» прымалі мноства віншаванняў — як афіцыйных, ад Міністэрства культуры, Мінгарвыканкама, так і сяброўскіх, ад даўніх і новых партнёраў, калег. Так, **актрыса Ірына ВІНАГРАДАВА** прыехала з Германіі і прывезла ў падарунак фэсту ляльку Фелікса, які, між іншым, нарадзіўся таксама пяць гадоў таму ў Лялечным тэатры казкі Санкт-Пецярбурга.

Таксама віншаванні і падарункі да пяцігоддзя «Нябёсаў» зрабілі выхаванцы дзіцячага садка і школы «Іхвіс» пры Свята-Елісавецінскім манастыры, удзельнікі грамадскай ініцыятывы «Домік інклюзіўны», актрыса Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек Яна Агеенка і многія іншыя.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота аўтара.**

# Карты для балельшчыкаў

РУП «Белкартаграфія» выпусціць турыстычныя карты Беларусі і Мінска спецыяльна да II Еўрапейскіх гульняў

**Усяго іх будзе чатыры: «Запрашаем у Беларусь. Турысцкая карта» на рускай і англійскай мовах, «Мінск. Турысцкая карта» і «Мінск спартыўны» — на рускай, Sports Minsk — на англійскай.**

На ўжо выпушчанай у маштабе 1:53 000 карце «Мінск. Турысцкая карта» цэнтр горада адлюстраваны больш падрабязна — у маштабе 1:12 000. На карце пазначаны асноўныя славутасці горада з іх кароткім апісаннем, фатаграфіямі і адрасамі. Тут ёсць і кантактная інфармацыя дыпламатычных прадстаўніцтваў, гасцініц, музеяў, асноўных спартыўных комплексаў, рэстаранаў беларускай кухні. На карце «Мінск спартыўны» з планам горада ў маштабе 1:40 000 будзе пазначана месцазнаходжанне станцый метро, асноўных спартыўных аб'ектаў, дзе будуць праводзіцца спаборніцтвы II Еўрапейскіх гульняў. Таксама тут пакажуць і агульныя звесткі аб Гульнях і месцах правядзення спаборніцтваў па кожным відзе спорту. «Белкартаграфія» выпусціць карты за кошт уласных сродкаў.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

### У тэму

Турысты ўжо пачалі браніраваць месцы ў беларускіх аграсядзібах на час II Еўрапейскіх гульняў, паведаміла **старшыня БГА «Адпачынак у вёсцы» Валерыя КЛІЦУНОВА.** У сувязі з Еўрапейскімі гульнямі ў бягучым годзе плануецца перанесці тэрміны правядзення Дня адкрытых дзвярэй у аграсядзібах — традыцыйна гэта мерапрыемства праводзіцца ў маі, але цяпер яго хочуць арганізаваць у чэрвені. Цяпер цэны на адны суткі ў аграсядзібе са сняданкам вар'іруюцца ад $7—10, а ў сярэднім складаюць $20—25. У Мінспорту разлічваюць, што аграэкатурызм у 2019 годзе прыцягне ў краіну яшчэ больш гасцей, і павелічэнне турпатоку адбудзецца ў тым ліку дзякуючы II Еўрапейскім гульням. «Чакаецца, што на гульні прыбудзе каля 18 тысяч афіцыйных асоб. Па выніках правядзенага разам з Дырэкцыяй Гульняў аналізу мы таксама бачым, што менавіта турыстаў, балельшчыкаў прыедзе яшчэ каля 30 тысяч», — расказаў **намеснік дырэктара Дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Віталь ГРЫЦЭВІЧ.**

### Надвор'е

# Мокры снег, які будзе пераходзіць у дождж

## У нядзелю значна пацяплее, месцамі да плюс 3 градусаў

**На гэтым тыдні ў нашай краіне ўсталявалася сапраўднае зімовае надвор'е. Тэмпературны фон утрымліваўся ў асноўным на 3—7 градусаў ніжэй за кліматычную норму, а ў начны час тэмпература паветра месцамі апускалася да мінус 15—20 градусаў. Цяпер на большай частцы тэрыторыі краіны вышыня снежнага покрыва складае ад 10 да 32 см, толькі ў паўднёва-заходніх раёнах снегу менш. Але ў выхадныя дні надвор'е будзе мяняцца. У нядзелю атмасферныя франты прынясуць ападкі і пацяплее, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння ўдзень у краіне захаваецца марознае надвор'е, месцамі пройдзе невялікі снег, на асобных участках дарог магчымая галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра будзе ад мінус 5 да мінус 11 градусаў.

У першы дзень выхадных будзе халоднае надвор'е. Так, у суботу да нас прыйдуць франтальныя раздзелы, якія ссоўваюцца з боку паўночнага захаду Еўропы. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдзе снег. Месцамі чакаецца слабая мяцеліца, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ў асноўным 4—11 марозу, па ўсходзе краіны — да мінус 12—15 градусаў. Удзень будзе ад нуля да мінус 6 градусаў.

А вось у нядзелю тэрыторыя Беларусі апынецца пад уплывам франтальных раздзелаў і цёплых паветраных мас з Заходняй Еўропы. На большай частцы тэрыторыі чакаюцца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу, які будзе пераходзіць у дождж. Удзень значна пацяплее, чакаецца ад трох градусаў марозу да трох цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак надвор'ем таксама будуць кіраваць атмасферныя франты.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТОТЫДНЁВЫЯ ЗВАНКІ — ДОБРАЯ ТРАДЫЦЫЯ

**Прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 12 студзеня ў аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме. З 9.00 да 12.00 на пытанні будуць адказваць:**

першы намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Пётр Васілевіч РАБКАВЕЦ. Тэл. 8 016 221 31 21;

першы намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Алег Сяргеевіч МАЦКЕВІЧ. Тэл. 8 021 222 22 22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Уладзіміравіч ГАРБАЧОЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;

першы намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Іван Алейзавіч ЖУК. Тэл. 8 015 273 56 44;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Віктар Уладзіміравіч НЕКРАШЭВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;

першы намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Ігар Мікалаевіч МАКАР. Тэл. 8 017 500 41 60;

кіраўнік спраў МІНСКАГА гарвыканкама Ганна Мар'янаўна МАЦЕЛЬСКАЯ. Тэл. 8 017 222 44 44.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА



### Трамп назваў «пустым марнаваннем часу» сустрэчу з дэмакратамі па «шатдаўне»

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп пакінуў сустрэчу са спікерам Палаты прадстаўнікоў Нэнсі Пэласі і лідарам дэмакратаў у Сенаце Кангрэса Чакам Шумерам, якая праходзіла ў Белым доме ў сераду. Палітыкі адмовілі ў просьбе прэзідэнта выдзеліць сродкі на будаўніцтва сцяны на амерыкана-мексіканскай граніцы ў выпадку, калі ён адновіць работу федэральнага ўрада. Пра гэта расказаў сам кіраўнік дзяржавы ў Twitter.

«Толькі што пакінуў сустрэчу з Чакам і Нэнсі, пустая трата часу», — напісаў Трамп. Ён спытаў лідараў дэмакратаў, што адбудзецца праз 30 дзён, калі ён адобрыць аднаўленне работы ўрада — ці зацвердзяць яны фінансаванне будаўніцтва «сцяны або стальной агароджы» на мяжы. «Нэнсі сказала: «Не». Я развітаўся, пакуль нічога не працуе!» — адзначыў Трамп.

У сустрэчы браў удзел і віцэ-прэзідэнт ЗША Майкл Пенс, які пацвердзіў журналістам такі ўчынак кіраўніка дзяржавы.

### NASA просіць «Раскосмас» распрацаваць «Саюз» для палётаў на Месяц



NASA просіць карпарацыю «Раскосмас» распрацаваць версію касмічнага карабля «Саюз» для палётаў на Месяц. Пра гэта паведаміў у інтэрв'ю тэлеканалу «Расія-24» генеральны дырэктар дзяржкарпарацыі Дзмітрый Рагозін.

«Просяць распрацаваць версію «Саюза», які мог бы даляцець да Месяца і вярнуцца назад, з тым, каб стварыць другую рэзервовую касмічную транспартную сістэму», — сказаў Рагозін.

Ён таксама адзначыў, што NASA настойвае, каб Расія працягвала дастаўляць амерыканскіх астранаўтаў на караблях «Саюз» на МКС.

Як паведамлялася раней, ЗША плануюць рэалізаваць праграму з міжнародным удзелам Deep Space Gateaway па стварэнні пастаянна дзеючай калямесяцавай станцыі, да якой рэгулярна будуць адпраўляцца караблі з Зямлі.

### Інфляцыя ў Венесуэле за год склала каля 1,7 млн працэнтаў

Такую ацэнку апублікаваў Рафаэль Гусман, кіраўнік камітэта па фінансах Нацыянальнай асамблеі (аднапалатнага парламента), якая знаходзіцца пад кантролем палітычных праціўнікаў урада на чале з прэзідэнтам Нікаласам Мадурам.

«2018 год скончыўся з інфляцыяй амаль у 1 700 000 %, — напісаў Гусман у сваім Twitter. — З такім паказчыкам Венесуэла ўвайшла ў лік трох краін з самай высокай інфляцыяй у сусветнай гісторыі». На думку палітыка, гэта стала вынікам дзейнасці тых, хто «трымае ўладу і не прапаноўвае рашэнняў для выхаду з крызісу», які перажывае краіна.



# ЗБЕРАЖЭННЯМІ ТРЭБА КІРАВАЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Безадзыўныя ўклады, наадварот, чакаюць свайго часу. Вы ўносіце грошы на дэпазіт і забіраеце іх толькі пасля заканчэння таго тэрміну, які ўказаны ў дагаворы. Сітуацыі бываюць розныя, і ў форс-мажорных абставінах банк можа пайсці вам насустрач і датэрмінова вярнуць грошы, але для гэтага патрэбныя важкія падставы. Стаўкі па безадзыўных дэпазітах заўсёды прывабныя і вышэйшыя. Давайце параўнаем: гадавая стаўка банка адзыўнага ўкладу на 4 месяцы — 6 %, безадзыўнага — ужо 9,2 %. Адрозненні будуць заўсёды, незалежна ад тэрміну, на які вы кладзяце свае грошы ў банк.

Каб прыцягнуць кліентаў, банкі сёння прапануюць нядрэнныя працэнты на безадзыўныя ўклады нават на кароткія тэрміны. Стаўкі памерам 9—9,2 % гадавых цяпер можна знайсці на дэпазіце на тэрмін 35, 65 і 95 дзён. Таксама 9,2 % гадавых можна атрымаць за ўклад на тэрмін у тры ці чатыры месяцы. А вось за дэпазіт на 190 дзён банкіры дадуць 10,3 % гадавых. Самая добрая стаўка, якая роўная 12,5 % гадавых, прадугледжана за безадзыўны ўклад на тэрмін 14 месяцаў і больш.

## СТАЎКА ФІКСАВАНАЯ, АЛЕ ЁСЦЬ НЮАНСЫ

Большасць дэпазітаў, асабліва з невялікімі тэрмінамі, маюць пастаянную працэнтную стаўку, якая самастойна банкамі мяняцца ўжо не можа. Наогул, банкі цяпер не могуць памяншаць стаўкі па дэпазітах у аднабаковым парадку. Гэта стала правілам, якое зафіксаваў рэгулятар яшчэ ў лістападзе мінулага года, але...

З названага правіла маецца выключэнне: дагаворы са зменнай стаўкай, што залежыць ад паказчыка, змяненне якога адбываецца незалежна ад банка. У прыватнасці, такім параметрам можа быць стаўка рэфінансавання Нацыянальнага банка. Таму некаторыя банкі, апісваючы стаўку на працяглыя тэрміны, адзначаюць, што яна роўная стаўцы рэфінансавання плюс-мінус нейкі працэнт.

Акрамя таго, банкі пазбавіліся магчымасці зарабляць сродкі яшчэ некалькімі спосабамі, якія ў Нацыянальным банку палічылі непрымальнымі. У прыватнасці, ім забаронена браць грошы за інфармацыю аб умовах крэдытавання і разгляд заявы аб выдачы крэдыту, а таксама за адкрыццё банкаўскага рахунку і залічэнне на яго крэдыту.

## ВАЛЮТА ЗІМОЙ НЕ КАЦІРУЕЦЦА

Традыцыйна ўклады дзеляцца і па тыпе валюты: можна адкрыць рублёвы або валютны дэпазіт. Натуральна, стаўкі па першым заўсёды вышэйшыя. Напрыклад, максімальная стаўка, якую можна знайсці на ўклад у беларускіх рублях, — 12,5 % гадавых.

Калі грошы вы збіраеце на працягу года для мэтавай пакупкі ў айчыннай валюце, то лепш аддаваць перавагу рублям. Чаму? Наш рубель таннее ў адносінах да долара ў сярэднім на 5—6 % у год. Пакуль гэта было так, ва ўсякім выпадку, у апошнія два гады дакладна. Возьмем па максімуме 6 % і адымем ад нашых 12,5 %. Атрымліваем рэальныя 6,5 % з пераводам у валюту. Узяць больш працэнт ад укладу ў валюце можна толькі, калі вы маеце смеласць «гуляць» у карпатыўныя валютныя аблігацыі. Дарэчы, з сакавіка і іх ужо не будзе.

Зусім іншы варыянт атрымліваецца, калі вы плануеце паехаць летам за мяжу ці ўжо доўгі час збіраеце грошы на нерухомасць. У гэтым выпадку вам лепш, відаць, выбраць валютны ўклад, тут ваш выбар залежыць ад актуальнай на сёння доларавай інфляцыі. Працэнты па валютным укладзе невялікія — максімум 2 % гадавых. Сярэдняя стаўка па доўгатэрміновых укладах складае ад 1 % да 1,5 %.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**У тэму**

### Па валютных аблігацыях — аж да поўнага выканання абавязацельстваў эмітэнтам

У мэтах дэдаларызацыі эканомікі нашай краіны была распрацавана пастанова Нацбанка № 612, якая адмяняе шэраг дазволеных выпадкаў выкарыстання замежнай валюты ў разліках паміж рэзідэнтамі:

— па аперацыях з аблігацыямі, намінаванымі ў замежнай валюце, юрыдычных асоб — рэзідэнтаў і банкаў;

— пры ажыццяўленні валютных аперацый паміж банкамі, за выключэннем банкаўскіх аперацый;

— пры спагнанні банкамі ўзнагароджання (платы) пры ажыццяўленні банкаўскіх аперацый, за выключэннем працэнтаў за карыстанне крэдытам у замежнай валюце, працэнтаў па ўкладах (дэпазітах) у замежнай валюце;

— па асобных відах дагавораў страхавання і сустрахавання.

Пастанова № 612 уступае ў сілу з 1 сакавіка гэтага года. Для выканання абавязацельстваў па раней заключаных дагаворах гэтай пастановай прадугледжваюцца пераходныя палажэнні.

«У прыватнасці, устаноўлена, што па дагаворах з вызначаным тэрмінам дзеяння, заключаных да даты афіцыйнага апублікавання пастановы № 612, разлікі ў замежнай валюце праводзяцца на ўмовах, устаноўленых у гэтых дагаворах. Разам з тым пры змене істотных умоў гэтых дагавораў пасля даты афіцыйнага апублікавання пастановы № 612, у тым ліку ў частцы падаўжэння тэрмінаў іх дзеяння, умовы гэтых дагавораў павінны прадугледжваць, што з 1 сакавіка 2019 года разлікі па іх (у выпадку іх правядзення) павінны ажыццяўляцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі гэтай пастановы», — гаворыцца ў інструкцыі Нацбанка.

Па аблігацыях рэзідэнтаў, намінаваных у замежнай валюце, выпуск якіх зарэгістраваны ў нашай краіне да даты афіцыйнага апублікавання пастановы № 612, выкарыстанне замежнай валюты дапускаецца да поўнага выканання абавязацельстваў эмітэнтам.

# У выйгрышы інтэрнэт-маркетолагі...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Павышэння ўзроўню беспрацоўя ў ведамстве таксама не прагназуюць. Як і істотнага павелічэння заробкаў. Калі арыентавацца на прагнозныя паказчыкі, то рэальная заработная плата ў бягучым годзе ў параўнанні з 2018-м вырасце на 4 % у бюджэтнай сферы і на 3,8 % у рэальным сектары эканомікі.

Спіс запатрабаваных прафесій збольшага не змяняецца. У версе рэйтынга работнікаў, якіх найчасцей шукаюць наймальнікі, — урачы, медсёстры, кіроўцы аўто, кухары і прадаўцы. У сталіцы ў попыце застануцца таксама прыбіральшчыкі, а ў рэгіёнах — ветэрынарныя ўрачы, аператары машыннага даення, трактарысты-машыністы, электраманцёры па рамонце і абслугоўванні электраабсталявання.

## Час прафесіяналаў

**Дырэктар кадравага агенцтва «Калекцыя адкрыццяў» Ірына ШАТКОЎСКАЯ** адзначае, што летась назіраўся рост вакансій у сферы ІТ, продажаў, інтэрнэт-маркетынгу. Запатрабаваны былі бухгалтары — але менавіта галоўныя, а не пярвічнага звяна, бо работа апошніх у большасці аргаміна аўтаматызавана. Складанасці з рабочымі месцамі былі ў будаўніцтве і банкаўскай галіне. Хутчэй за ўсё такія тэндэнцыі захаваюцца і ў 2019-м.

Змяніліся патрабаванні да кіраўнікоў. Умення арганізаваць працэс ужо недастаткова — неабходны дадатковыя навыкі і вопыт менавіта ў той дзейнасці, якой займаецца кампанія.

— Ведаю, што на рабочых спецыялістаў высокага ўзроўню — слесараў, мантажнікаў — вялікі попыт, і ў іх дастаткова высокія заробкі, — дадае Ірына Шаткоўская. — Цяпер настае час прафесіяналаў з вялікай літары. Калі вы майстар у сваёй справе, не важна ў якой галіне вы працуеце, — вы дакладна знойдзеце работу. Трэба заўсёды аналізаваць свой узровень адукацыі і ўвесь час яго павышаць. Тым больш цяпер ёсць шмат магчымасцяў, курсаў — у тым ліку бясплатных. Не чакайце, што вам нехта дапаможа, штосьці зменіцца. Трэба за сябе змагацца і канкурыраваць за добрыя месцы на рабоце.

З цікавых тэндэнцый мінулага года — часта саіскальнікам быў важны не заробак, а імідж кампаніі. Некаторым прадпрыемствам вельмі складана знайсці супрацоўнікаў з-за дрэннай рэпутацыі на рынку. «Мы чулі, тут вялікая цякучка, затрымліваюць заробкі», — адмаўляюцца ад такіх прапаноў кандыдаты. Нават калі ім тлумачаць, што сітуацыя ў кампаніі змянілася, у іх застаецца сумненні. Таму задача для прадпрыемстваў на бягучы год — падымаць свой імідж. Інакш цэнных спецыялістаў прыцягнуць не ўдасца.

Катэгорыя, у якой будуць складанасці з працаўладкаваннем, — людзі за 50.

— Многія з іх — з велізарным вопытам, у добрай фізічнай форме, гатовы развівацца. І гэта такая несправядлівасць з боку наймальнікаў адмаўляць ім толькі з прычыны ўзросту, — кажа Ірына Шаткоўская. — Мы са свайго боку працуем з кампаніямі, каб адсунуць гэту ўзроставую планку. Важна мяняць свядомасць работадаўцаў, каб яны давалі магчымасць прафесіяналам у сваёй галіне працягваць працаваць.

Тым, хто знаходзіцца на старце кар'еры ці вырашыў памяняць прафесію, эксперт раіць пры выбары сферы дзейнасці адштурхоўвацца ад двух крытэрыяў — сваіх перавагі тэндэнцый на рынку працы. Важна адэкватна ацэньваць сябе: абяцаць спецыялісту-пачаткоўцу заваблачны заробак ніхто не будзе — нават у такой высокааплатнай сферы, як ІТ.

Іншая парада — пастарацца манетызаваць сваё хобі. Магчыма, з вашага захаплення мовамі ці рукадзеллем рэальна зрабіць крыніцу дадатковага або асноўнага заробку.

**Толькі лічбы**

Згодна з Агульнарэспубліканскім банкам вакансій, заробкі да 400 рублёў прапануюць у 30,5 % выпадкаў, ад 400 да 600 — у 36,5 %, ад 600 да 800 — у 20,7 %. Плаціць ад 800 да 1000 рублёў гатовы толькі на 7,3 % вакансій, а больш за тысячу — 5 %.

## Прыцягальнае замежжа

Не ўсе эксперты глядзяць на 2019-ы з аптымізмам. Сёлета саіскальнікам чакаюць не вельмі радасныя перспектывы, лічыць **кіраўнік агенцтва па працаўладкаванні «Першае рашэнне» Інеса ЦІШКЕВІЧ.**

— Яшчэ Мінск больш-менш трымаецца, рабочыя месцы ёсць, і заробкі адносна нядрэнныя. Але ў цэлым па краіне сярэдні заробак па вакансіях — 500 рублёў. І людзі пагаджаюцца на такую работу. На жаль, шмат прапаноў з заробкамі і па 300, і па 400 рублёў, людзей афармляюць на палову стаўкі.

Калі казаць пра рабочы клас, то патрабуюцца ўпакоўшчыкі, камплектоўшчыкі. Неабходны адміністратары, але па аплаце такія вакансіі нявыгадныя — наймальнікі спасылаюцца на дарагую арэнду і высокія камунальныя плацяжы, якія не дазваляюць больш плаціць персаналу.

На думку Інесы Цішкевіч, беларусы часцей будуць шукаць вакансіі за мяжой.

— Калі раней цікавіліся работай вахтавым метадам па Беларусі, то цяпер саіскальнікі скіраваны на Захад — разглядаюць Польшчу, Літву. Едуць не толькі будаўнікі, але і фасоўшчыкі, камплектоўшчыкі. Гэта могуць быць нават грамадзяне з некалькімі вышэйшымі адукацыямі, якія не здольны сябе прымяніць і ідуць на простыя работы.

Сярод спецыялістаў, заўважае эксперт, як правіла, на адно добрае месца вялікі конкурс. Так, на вакансію начальніка гаспадарчага ўпраўлення можа прэтэндаваць шэсць-восем чалавек.

— Цяпер неспрыяльны час, каб мяняць рабочае месца, — мяркуе Інеса Цішкевіч. — Калі ў вас скончыўся кантракт і вам прапанавалі яго працягнуць — працягвайце. Раю спачатку знайсці работу, а потым звальняцца.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**


### ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4 этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **WWW.BELTORGI.BY**.

Продавец: Индивидуальный предприниматель Машканов Павел Валерьевич (УНП 190160440) в лице антикризисного управляющего Зюзькевич О.В. *Публичные торги в электронной форме в процедуре экономической несостоятельности (банкротства)* (далее – торги) будут проведены: **11 февраля 2019 г**. с 09.00 до 17.00 на электронной торговой площадке **WWW.BELTORGI.BY**. Срок приема заявок и задатков для участия в торгах – по 08.02.2019 г. 17.00.

| Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. без НДС |
|---|---|
| Автомобиль Chevrolet Cavalier, 2001 г. в. | 2 800,00 |
| Местонахождение – г. Минск, ул. Брестская, 77а , тел. для ознакомления и осмотра +375 29 6320410 | |

Продавец: ООО «Молодечно-Асстрой-Сервис» (УНП 691289711) в лице антикризисного управляющего ИП Лужинского А. И. Повторные торги будут проведены: **28 января 2019 г**. с 09.00 до 17.00 на электронной торговой площадке **WWW.BELTORGI.BY**. Срок приема заявок и задатков для участия в торгах – по 25.01.2019 г. 17.00. Извещение о ранее проведенных торгах опубликовано в «Сельской газете» 19.11.2018 г.

| Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. без НДС |
|---|---|
| Полуприцеп бортовой тентовый KOEGEL SNC 024, 2012 г. в., цвет серый | 11 520,00 |
| Местонахождение – Минская, обл., Узденский р-н, аг. Слобода, тел. для ознакомления и осмотра +375 29 698 53 04 | |

**Для участия в торгах необходимо:** 1) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY06SOMA30120013860101000933 в ЗАО «Идея Банк», код SOMABY22, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация», 2) подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте WWW.BELTORGI.BY, 3) направить в отсканированном виде все прилагаемые к заявке документы по адресу: marketing@zalog.by (подробнее – в информации лота на сайте WWW.BELTORGI.BY).

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов.

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Оформление результатов торгов в день их проведения.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а так же аукционный сбор. После этого между продавцом и победителем торгов в течение пяти дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи




## РАНА Ў РАЙ

Што ні кажы, а ў вёсцы цікавей жывецца. Усе тут адзін аднаго ведаюць, вітаюцца. Не тое, што ў горадзе: там дзверы ў дзверы часам жывуць, і ні табе «Дабрыдзень», ні потым «Бывай».

У Вадзіма з Пятром — карэнных гараджан — усё было інакш: сябравалі яны з дзяцінства, не цураліся сустрэч і ў дарослым жыцці. Любілі пасядзець то ў кафэ (калі грошы былі), то за столікам ля пад'езда, выпіць па грамульцы-другой, але ж, як правіла, у будныя дні, бо ў выхадныя...

У Вадзіма другі год як з'явілася дача, таму кожную суботу ён імкнуўся туды. Аднойчы запрасіў і сябра — адпачыць, а заадно — дапамагчы, калі той не супраць.

— А чаму б і не? Трэба — значыць, трэба, — пагадзіўся Пятро. — Не ўсё ж бакі на канапе адлежваць.

Карацей, у суботу а палове шостай раніцы ён ужо стаяў у двары каля знаёмай машыны. У хуткім часе туды ж прыйшоў Вадзім са сваёй жонкай, і яны паехалі.

На лецішчы, на свежым паветры ды за работай дзень у мужчын праляцеў незаўважна. Удвух яны падлаталі дах (аднаму там зусім нязручна было б), пафарбавалі плот. Часу хапіла нават на тое, каб па лесе прайсціся ў бок сажалкі, каб трохі паплюхацца там у прахалоднай вадзіцы.

Пакуль яны гэта рабілі, гаспадыня сабрала вячэру, паклікала за шчодры стол.

...Засядзеліся за ім сябры: нешта елі-пілі, успаміналі мінулае, нават заспявалі пад раніцу...

Што далей было, Пятро не памятаў, бо заснуў там жа, у альтанцы за сталом.

Гаспадыня хацела пабудзіць яго, завесці неяк у хату, але потым перадумала: ночы стаялі цёплыя, лаўка ў альтанцы шырокая і нават з матрацам... Заставалася прынесці падушку ды зверху накінуць лёгкую коўдру.

Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 3 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов.

Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому частнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Организатор аукциона вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до даты их проведения.

Порядок проведения торгов и оформление участия в торгах определяется условиями о проведении торгов, ознакомиться с которым можно в дни приема заявлений на участие в торгах, а также на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 28.11.2018.

Аукцион состоится **28.01.2019 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **25.01.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17**

## Извещение о проведении 25 января 2019 года повторных торгов с условиями по продаже единым предметом торгов имущества, находящегося в хозяйственном ведении унитарного предприятия «АгроМАЗ»

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)** | Здание АБК-теплицы общей площадью 1073,8 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Березинский р-н, Березинский с/с, 1 (инв. номер в ЕГРНИ 611/С-30407); котельная теплицы общей площадью 550,1 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Березинский р-н, Погостский с/с, г. Березино (инв. номер в ЕГРНИ 611/С-27365) |
| **Сведения о земельном участке** | Площадь – 6,6463 га, кадастровый номер 620483800001000013, целевое назначение: земельный участок для ведения товарного сельского хозяйства |
| **Продавец имущества** | Сельскохозяйственное унитарное предприятие «АгроМАЗ», 223329, Минская область, Березинский район, д. Любушаны |
| **Организатор торгов** | Государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10 |
| **Начальная цена предмета торгов без учета НДС** | 215 924,66 бел. руб. |
| **Сумма задатка** | 21 600,00 бел. руб. |
| **Условие торгов** | Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов |

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, находящегося в хозяйственном ведении унитарного предприятия «АгроМАЗ».

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона (с условиями) на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) по согласованию с продавцом в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся 25 января 2019 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 11.01.2019 по 23.01.2019 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(01715) 64-632 (унитарное предприятие «АгроМАЗ»)

## РЕЗУЛЬТАТ РОЗЫГРЫША ЦЕННЫХ ПРИЗОВ СРЕДИ УЧАСТНИКОВ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ
## «СЧАСТЛИВЫЙ СЛУЧАЙ В ОСТРОВЕ ЧИСТОТЫ С PROCTER & GAMBLE! ТУР 12»

**1. Сведения об организаторе.**

Общество с ограниченной ответственностью «Торговая компания Ромакс» (Далее – Организатор).

УНП 190761848. Зарегистрирован решением Минского горисполкома от 04.10.2006 г. № 2011. Регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 190761848.

Местонахождение Организатора: 220068, г. Минск, ул. Каховская, д. 70А, пом. 8.

Почтовый адрес: 220068, г. Минск, ул. Каховская, д.70А, пом. 8 (5-й этаж).

**2. Наименование рекламной игры.**

«Счастливый случай в Острове чистоты с Procter & Gamble! Тур 12»

**3. Сроки проведения.** 05.12.2018 – 31.01.2019 (включая период розыгрыша и вручения призов). Розыгрыш призов 1, 2 и 3 уровня проведен 29 декабря 2018 года с 16.00 по 20.00 по адресу г. Минск, пр-т Победителей, 111, холл 2-го этажа МКСК «Минск-Арена». Розыгрыш призов 4, 5 и 6 уровня проведен 27 декабря 2018 года в 13.00 по адресу: г. Минск, ул. Стороржовская, 15.

**4. Сведения о государственной регистрации рекламной игры.** Свидетельство № 3438 рекламной игры «Счастливый случай в Острове чистоты с Procter & Gamble! Тур 12», 29 ноября 2018 г. МАРТ Республики Беларусь.

**5. Сведения о количестве участников рекламной игры.** В рекламной игре принято участие 163079 участников.

**6. Сведения о полном или частичном розыгрыше призового фонда.** Призовой фонд сформирован за счет имущества и денежных средств Организатора и был разыгран полностью.

В ходе розыгрыша определены Игровые коды получателей призов.

**<u>Результаты розыгрыша 27 декабря 2018 г.:</u>**

**Пылесос черный Gutrend G95B JOY стоимостью 387 белорусских рублей и денежное вознаграждение в размере 39,6 белорусского рубля**

| № п/п | № Игрового кода | № Дисконтной карты | Фамилия Имя Отчество |
|---|---|---|---|
| 1 | 1980660 | 3398385 | Боброва Анна Алексеевна |
| 2 | 1908308 | 2590676 | Вагнер Анна Георгиевна |
| 3 | 1905948 | 2017104 | Латвис Галина Станиславовна |
| 4 | 1788100 | 1483470 | Флорьянович Владимир Николаевич |
| 5 | 1942294 | 2189385 | Привалова Татьяна Сергеевна |

**Пылесос белый Gutrend G95B JOY стоимостью 387 белорусских рублей и денежное вознаграждение в размере 39,6 белорусского рубля**

| № п/п | № Игрового кода | № Дисконтной карты | Фамилия Имя Отчество |
|---|---|---|---|
| 1 | 1934743 | 2352216 | Стешиц Марина Николаевна |
| 2 | 1854519 | 2226643 | Шинкоренко Наталья Николаевна |
| 3 | 1844420 | 1638667 | Русак Елена Викторовна |
| 4 | 1798399 | 2328475 | Черная Елена Александровна |
| 5 | 1876425 | 1932973 | Левчик Тамара Анатольевна |

**Денежный приз в размере 300 белорусского рубля и денежное вознаграждение в размере 26,60 белорусского рубля**

| № п/п | № Игрового кода | № Дисконтной карты | Фамилия Имя Отчество |
|---|---|---|---|
| 1 | 1895555 | 1741790 | Андреева Татьяна Геннадьевна |
| 2 | 1974684 | 1953307 | Лупач Татьяна Михайловна |
| 3 | 1925814 | 1842128 | Дейчик Мария Александровна |
| 4 | 1950705 | 2553590 | Холод Полина Александровна |
| 5 | 1986322 | 3401815 | Стельмашук Екатерина Григорьевна |
| 6 | 1837406 | 2423359 | Минкевич Инесса Анатольевна |
| 7 | 1787908 | 1462562 | Бугай Елена Михайловна |
| 8 | 1920631 | 1770870 | Калиновская Юлия Вадимовна |
| 9 | 1888391 | 1969635 | Жегалик Галима Утепкалиевна |
| 10 | 1827132 | 1390678 | Бородич Елена Александровна |
| 11 | 1928135 | 2863546 | Сачук Александр Иванович |
| 12 | 1974190 | 1448255 | Златов Андрей Олегович |
| 13 | 1879578 | 2426572 | Буяк Светлана Валерьевна |
| 14 | 1978992 | 2687895 | Дегелько Николай Борисович |
| 15 | 1952902 | 1400137 | Черненкова Екатерина Михайловна |
| 16 | 1948501 | 1922253 | Синяк Кристина Васильевна |
| 17 | 1786880 | 1392671 | Гаджиев Рустам Гаджиахмедович |
| 18 | 1932248 | 1846074 | Снитко Виктория Трофимовна |
| 19 | 1795968 | 2070474 | Заславец Ирина Викторовна |
| 20 | 1937471 | 3284850 | Окулик Андрей Анатольевич |
| 21 | 1883561 | 3298432 | Коробко Татьяна Ивановна |
| 22 | 1867398 | 2137163 | Велюга Валентина Васильевна |
| 23 | 1849559 | 3177704 | Лизунова Оксана Александровна |
| 24 | 1962348 | 1314071 | Исупова Светлана Михайловна |
| 25 | 1930300 | 1453012 | Качан Анна Степановна |
| 26 | 1890240 | 2552831 | Гавриленко Галина Александровна |
| 27 | 1802876 | 2922971 | Коваленко Дина Сергеевна |
| 28 | 1936945 | 3068524 | Подшивалов Вадим Вадимович |
| 29 | 1957450 | 2102145 | Товт Инна Геннадьевна |
| 30 | 1869303 | 2936105 | Стеблова Юлия Васильевна |

**<u>Результаты розыгрыша 29 декабря 2018 г.:</u>**

**Автомобиль KIA RIO_FB, Z94C251AAKR038783, РФ стоимостью 25470 белорусских рублей и денежное вознаграждение в размере 3787,63 белорусского рубля**

| № п/п | № Игрового кода | № Дисконтной карты | Фамилия Имя Отчество |
|---|---|---|---|
| 1 | 1962397 | 1318972 | Сурмачевская Вероника Арнольдовна |

**Мобильный телефон Huawei P20 DS Black (EML-L29) 128Gb/4Gb стоимостью 1329 белорусских рублей и денежное вознаграждение в размере 180,36 белорусского рубля**

| № п/п | № Игрового кода | № Дисконтной карты | Фамилия Имя Отчество |
|---|---|---|---|
| 1 | 1833432 | 1976921 | Аскерко Светлана Николаевна |
| 2 | 1980507 | 3316713 | Янковая Анастасия Романовна |
| 3 | 1880673 | 2659127 | Василюк Анна Александровна |
| 4 | 1978968 | 2683321 | Сидоренко Анастасия Генадьевна |
| 5 | 1806769 | 1867997 | Бондаренко Наталья Михайловна |
| 6 | 1793495 | 1920391 | Балакшина Ирина Леонидовна |
| 7 | 1807348 | 2719321 | Улуфер Оксана Александровна |
| 8 | 1884840 | 2272705 | Антюшеня Ольга Райладовна |
| 9 | 1939928 | 1548143 | Нахват Татьяна Васильевна |
| 10 | 1788436 | 1518789 | Негуляева Ирина Тимофеевна |

**Телевизор LG43UK6200PLA стоимостью 884 белорусских рублей и денежное вознаграждение в размере 113,86 белорусского рубля**

| № п/п | № Игрового кода | № Дисконтной карты | Фамилия Имя Отчество |
|---|---|---|---|
| 1 | 1842278 | 1738917 | Радкевич Катерина Сергеевна |
| 2 | 1852160 | 1607367 | Давыденко Ольга Леонидовна |
| 3 | 1943972 | 2853979 | Солошенко Инна Владимировна |
| 4 | 1803740 | 3027622 | Куракина Ирина Павловна |
| 5 | 1928580 | 3128892 | Трофимчук Сергей Леонидович |
| 6 | 1871608 | 1339719 | Рословцева Анна Павловна |
| 7 | 1905285 | 1912957 | Михалевич Анастасия Васильевна |
| 8 | 1876699 | 1377153 | Белан Лариса Львовна |
| 9 | 1912628 | 1463125 | Радюк Татьяна Ивановна |
| 10 | 1785630 | 1310427 | Гаврилюк Вадим Борисович |

**8. Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры.**

(8044) 700-13-33, (8033) 686-37-37 с 09.00 до 21.00, а также на сайте ostrov-chistoty.by

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** У панядзелак непажадана дазваляць сабе занадта расслабляцца. Лепш сабрацца і пачаць працоўны тыдзень з дакладнага планавання. У сераду перш чым узяцца за новую справу, правільна ацаніце свой патэнцыял, бо лепш зрабіць менш, але больш якасна. У выхадныя паспрабуйце знайсці дастаткова часу для вырашэння праблем блізкіх людзей, ім цяпер відавочна патрэбна ваша дапамога.

**ЦЯЛЕЦ.** На гэтым тыдні верагодныя перамены, якія істотна паўплываюць на многія сферы вашага жыцця, магчымы нават пераезд на новае месца жыхарства, выкліканы новымі абставінамі. Добры час для ачышчэння ад усяго лішняга, аджылага. У пятніцу трэба адкрыта пагаварыць са старымі сябрамі, толькі не перашчыруйце ў адстойванні сваіх поглядаў.

**БЛІЗНЯТЫ.** Вы цяпер у цэнтры ўвагі, поўныя сіл і энергіі. А галоўнае — любімыя і каханыя. Вас чакае вельмі гарачае спатканне. У сераду задуманае ўдасца ажыццявіць, калі ператворыце сваё абурэнне ў дзелавую актыўнасць. Памятайце, што часовыя няўдачы — следства вашых спроб выйсці на новы ўзровень жыцця. Гэта нармальна і азначае, што вы паступова прасоўваецеся ў патрэбным кірунку. Дазвольце сабе паўнавартасны адпачынак у выхадныя.

**РАК.** Час свят скончыўся, надышоў перыяд напружанай працы. Неабходна будзе мабілізаваць усе свае сілы і магчымасці для рашучага рыўка. Не звяртайце ўвагі на дробныя няўдачы, яны не змогуць паўплываць на ваш поспех, які ўжо не за гарамі. Навакольныя будуць добразычліва ставіцца да вашых пачынанняў. Варта быць выбіральнымі ў зносінах і як мага больш сабранымі.

**ЛЕЎ.** На гэтым тыдні ўдача будзе добразычлівая да вас. Многія справы завершацца ўдала і на вашу карысць. Не пазбягайце зносін і новых знаёмстваў. Аўторак можа пагражаць клапатлівымі гаспадарчымі справамі, збольшага надакучлівымі, але па выніках уражальнымі. Серада злёгку збянтэжыць сваёй мітуснёй. У пятніцу не варта паказваць навакольным ступень сваёй уразлівасці, вашай слабасцю могуць скарыстацца.

**ДЗЕВА.** У першай палове тыдня цярпенне і такт дапамогуць захаваць пазіцыі ў адносінах — як дома, так і на рабоце. У чацвер у сяброўскіх адносінах можа скласціся неадназначная сітуацыя, многае будзе залежаць ад вашых дзеянняў. У суботу ўвечары было б дарэчы зладзіць маленькае сямейнае свята. У нядзелю пажадана пазбягаць шумных вечарынак, бо яны прынясуць толькі расчараванне і стомленасць.

**ШАЛІ.** Вы даведаецеся шмат новага пра сябе, але паспрабуйце не мяняць нічога навокал. Стан нявызначанасці можа працягнуцца некалькі дзён, і пакуль не наступіла яснасць, не прымайце нічый бок. У канцы тыдня магчыма напружанне ў адносінах з калегамі, начальствам або старэйшымі сваякамі. Гэта, хутчэй за ўсё, вынік непаразумення, шчыра пагаварыце і развейце ўсе сумневы.

**СКАРПІЁН.** Тэрмінова пачынайце новыя праекты, выкарыстоўвайце ўсю сваю інтэлектуальную энергію, на шчасце, яна не ведае межаў. На гэтым тыдні выпадзе спрыяльная магчымасць добра зарэкамендаваць сябе і падняцца па кар'ернай лесвіцы. Гэты момант удалы для самарэалізацыі і праявы талентаў. Не хавайце свае пачуцці, калі закаханыя.

**СТРАЛЕЦ.** Вы жывяце адчуваннем значнасці перамен, аднак не імкніцеся расставіць усё па сваіх месцах, сітуацыя стабілізуецца не адразу. Але ў рэшце рэшт плынь працягу жыцця вынесе вас у правільным напрамку. Праявіце сяброўскія пачуцці, і вы адчуеце падтрымку ў адказ. Важна аддзяліць галоўнае ад другараднага, інакш руціна пагражае паглынуць вас, а вынікі могуць не адпавядаць чаканню.

**КАЗЯРОГ.** У панядзелак устрымайцеся ад актыўнай дзейнасці, мітусні і балбатні. Не разменьвайцеся па дробязях, давярайце сваёй інтуіцыі, тады спадарыня Фартуна будзе ўсміхацца вам. Серада — спрыяльны дзень для рэалізацыі сумесных з дзелавымі партнёрамі планаў. У чацвер не выключаны складанасці і непаразуменні з калегамі. У выхадныя дні давядзецца адкарэктаваць свае фінансавыя планы.

**ВАДАЛІЎ.** На гэтым тыдні вы можаце адчуць хандру. Святы скончыліся, наперадзе — шэрыя будні. Аднак калі ўсё ж успомніце пра аптымізм, то зможаце актыўна ўключыцца ў рэалізацыю перспектыўных планаў, скарыць новыя вяршыні. І гэта шлях да поспеху. Паспрабуйце не выпусціць спрыяльны момант.

**РЫБЫ.** Усё ідзе паспяхова, калі не лічыць адной зусім нязначнай, але вельмі непрыемнай дэталі, і імя ёй — лянота. Калі вы яе пераадолееце, то ўсё будзе выдатна. Прапануйце начальству і партнёрам свае ідэі, планы і праекты, яны рэалістычныя, а значыць, хутка ўвасобяцца ў жыццё. Адкрыецца для сябе штосьці новае і адчуеце, што рухаецеся ў правільным напрамку.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.24 | 17.12 | 7.48 |
| Віцебск — | 9.20 | 16.54 | 7.34 |
| Магілёў — | 9.14 | 17.01 | 7.47 |
| Гомель — | 9.03 | 17.06 | 8.03 |
| Гродна — | 9.38 | 17.28 | 7.50 |
| Брэст — | 9.31 | 17.37 | 8.06 |

### Месяц

*Маладзік 6 студзеня. Месяц у сузор'і Рыб.*

### Імяніны

**Пр.** *Варвары, Ганны, Івана, Марка, Наталлі.* **К.** *Аляксандра, Марты, Фелікса.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




### ...у суседзяў

| Горад | Тэмпература |
|---|---|
| ВАРШАВА | -2..0°С |
| ВІЛЬНЮС | -2..0°С |
| КІЕЎ | -5..-3°С |
| МАСКВА | -11..-9°С |
| РЫГА | 0..+2°С |
| С.-ПЕЦЯРБУРГ | -3..-1°С |

## УСМІХНЕМСЯ

Знайшла эскізы татуіровак, якія захоўвала яшчэ ва ўніверсітэце. Упершыню радуюся таму, што ў мяне не было грошай.

**Дзеці — кветкі жыцця :)**

**Сын пагладжвае кошку і прыгаворвае:**

**— Мусечка, ты ведаеш, у чалавечым свеце жанчыны з вусамі не вельмі і цэняцца!**

Чалавек, які раздаваў флаеры ў касцюме вавёркі, вывеў з запою 167 мужыкоў.

**— Чаму ты не застаўся ў яе начаваць?**

**— У яе прозвішча Багамол...**




## Даты | Падзеі | Людзі

### 11 СТУДЗЕНЯ

У краіне

**1890** год — нарадзіўся (г. Масква) Міхаіл Іванавіч Барсукоў, вучоны ў галіне гісторыі медыцыны, доктар медыцынскіх навук, прафесар. Заснавальнік сацыяльнай гігіены ў Беларусі, адзін з арганізатараў аховы здароўя ў СССР, дзяржаўны дзеяч Беларусі. У 1924—1930 гадах — наркам аховы здароўя БССР, адначасова загадчык кафедры медыцынскага факультэта БДУ, у 1924—1929-м — рэдактар часопіса «Беларуская медыцынская думка». У 1930—1939 гадах узначальваў сектар аховы здароўя Дзяржплана СССР. Аўтар навуковых прац па гісторыі медыцыны, а таксама шырокамаштабных санітарных мерапрыемстваў. Памёр у 1974 годзе.

**1905** год — нарадзілася (вёска Лошніца, цяпер у Барысаўскім раёне) Тацццяна Васілеўна Бірыч, беларускі афтальмолаг, доктар медыцынскіх навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі, заслужаны ўрач Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы. Асноўныя навуковыя працы ў галіне хвароб вачэй, лячэння туберкулёзу і апёкаў вачэй, выдалення катаракты з дапамогай нізкіх тэмператур. Аўтар больш чым 150 навуковых прац, у тым ліку трох манаграфій. Памерла ў 1993 годзе.

**1929** год — нарадзіўся (Украіна) Віктар Сцяпанавіч Шавялуха, беларускі вучоны ў галіне фізіялогіі раслін, дзяржаўны дзеяч Беларусі, акадэмік УАСГНІЛ, акадэмік Аграрнай акадэміі навук Беларусі, доктар біялагічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Расіі. Аўтар навуковых прац па раслінаводстве, павышэнні прадукцыйнасці збожжавых і іншых культур. Памёр у 2018 годзе.

**1944** год — у ходзе Калінкавіцка-Мазырскай аперацыі быў вызвалены Ельскі раён. У вызваленні раёна ўдзельнічалі: 415-я стралковая дывізія 61-й арміі Беларускага фронту і 37-я Ельская партызанская брыгада (камандзір А. С. Мішчанка).

**1959** год — на базе майстэрняў па вырабе тавараў хатняга ўжытку заснаваны Мінскі завод халадзільнікаў.

У свеце

**1875** год — нарадзіўся Рэйнгольд Морыцавіч Гліэр, рускі кампазітар, дырыжор, музычны дзеяч, педагог, народны артыст СССР, доктар мастацтвазнаўства, прафесар. Аўтар балетаў «Чырвоны маяк», «Медны коннік», опер і іншых твораў. Тройчы лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР. Памёр у 1956 годзе.

**1919** год — Саўнаркам Савецкай Расіі прыняў дэкрэт аб увядзенні ў краіне харчразвёрсткі — сістэмы нарыхтовак сельскагаспадарчых прадуктаў. Заключалася ў абавязковай здачы сялянамі дзяржаве па цвёрдых цэнах усіх лішкаў хлеба і іншых прадуктаў звыш устаноўленых нормаў на асабістыя і гаспадарчыя патрэбы. Дарэчы, упершыню харчразвёрстка была ўведзена ў Расійскай імперыі 2 снежня 1916 года, але ў той жа час захоўвалася сістэма дзяржаўных закупак на свабодным рынку, якая дзейнічала раней.



**1960** год — загадам Галоўнакамандуючага ВПС К. А. Вяршыніна была арганізавана спецыяльная вайсковая часць, задачай якой была падрыхтоўка касманаўтаў. Пасля гэтая часць, размешчаная ў Зорным гарадку ў Падмаскоўі, была пераўтворана ў Цэнтр падрыхтоўкі касманаўтаў ВПС СССР.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.
Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 136.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Нумар падпісаны ў 19.30 10 студзеня 2019 года.

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

11 студзеня 2019 г. № 2 (487)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


ТЭМА ТЫДНЯ

**Наяўнасць асяроддзя, даступнага для людзей з абмежаваннямі, — гэта паказчык нашага стаўлення да... саміх сябе. Бо, згадзіцеся, ніхто не застрахаваны ад таго, што ў нейкі перыяд жыцця не страціць здольнасці хадзіць. Тыя ж прыступкі ў доме могуць стаць сур'ёзнай перашкодай і для маладых мам з каляскамі, і для людзей пажылога ўзросту, і для чалавека з цяжкімі сумкамі, і для таго, хто зламаў нагу. Такім чынам ад стварэння даступнага асяроддзя могуць выйграць вельмі многія. Як жа сёння ў Беларусі справы з даступнасцю? Якія планы з ёй на найбліжэйшы час?**



Фота БелТА.

# БЕЗ БАР'ЕРАЎ:

## КАБ ПРЫСТУПКІ НЕ СТАЛІ ПЕРАШКОДАЙ...

### Даступнае асяроддзе — неабходная ўмова сацыяльнай інтэграцыі асоб з інваліднасцю

### Што маем?

Трэба сказаць, у нашай краіне выкананне базавых нормаў па стварэнні безбар'ернага асяроддзя зараз з'яўляецца абавязковым для ўсіх арганізацый, якія ажыццяўляюць распрацоўку праектна-каштарыснай дакументацыі пры будаўніцтве новых будынкаў. Гэтыя нормы прапісаны ў тэхнічных нарматыўных прававых актах (тэхнічныя кодэксы, дзяржаўныя стандарты, тэхрэгламенты, тэхнічныя ўмовы). І новы будынак не прымаецца, калі там не забяспечана безбар'ернае асяроддзе. Але ў нас вельмі праблемным у гэтым плане з'яўляецца жыллё, якое было пабудавана раней, у першую чаргу «хрушчоўкі». Там забяспечыць доступ для людзей з абмежаванымі магчымасцямі вельмі складана.

«Мы прапануем людзям з інваліднасцю перасяляцца на першыя паверхі, — сказала «Звяздзе» **член Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Таццяна СТАРЫНСКАЯ**. — Але за ўвесь час маёй работы ў сацыяльнай службе Першамайскага раёна Віцебска (а гэта 10 гадоў) ні адзін чалавек з інваліднасцю не пагадзіўся на гэта. І я не чула пра такія выпадкі ў іншых раёнах».

Як выходзяць з сітуацыі? Ёсць дамы, дзе, па словах Таццяны Старынскай, робяць адкідныя пандусы на працягу трох-чатырох паверхаў, але яны небяспечныя і замінаюць іншым людзям. І, вядома, гэта не выйсце з сітуацыі.

— Нам трэба заканадаўча адрэгуляваць парадак уладкавання безбар'ернага асяроддзя ў дамах і кватэрах, дзе жывуць інваліды і сем'і, у якіх ёсць інваліды, а таксама ўладкавання безбар'ернага асяроддзя ў месцах агульнага карыстання, — адзначае **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандр РУМАК**. — Бо нярэдкія выпадкі, калі чалавек на калясцы змог падняцца па пандусе, але ўвайсці ў будынак усё роўна не можа. Таму што альбо шырыня дзвярэй не адпавядае нарматывам, альбо аказваюцца яшчэ прыступкі, па якіх падняцца чалавек з інваліднасцю не ў стане. Так, у нашым заканадаўстве ёсць усе адпаведныя нормы, але практыка паказвае, што часта ўзнікае шмат пытанняў, асабліва гэта датычыцца ўладкавання безбар'ернага асяроддзя ў месцы пражывання інваліда. Напрыклад, у нас у многіх будынках ліфты чамусьці пачынаюцца з другога паверха, і пандусаў да іх няма. Мы стараемся выправіць памылкі будаўніцтва мінулых гадоў, але гэта адбываецца з вялікай цяжкасцю. І чалавеку з інваліднасцю даводзіцца прыкладаць шмат намаганняў, каб скарыстацца сваім правам на даступнае асяроддзе.

Вельмі важна забяспечыць для такіх людзей бесперашкодны доступ не толькі да жылых аб'ектаў, але і да аб'ектаў сацыяльных, інжынерных, транспартных, да ўсёй інфраструктуры ўвогуле.

стар. 2

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ


### Інклюзіўны барыста



Якія яшчэ ідэі рэалізуе ініцыятыўны калясачнік з Ліды? стар. 3

### Урокі міласэрнасці



Разбураць бар'еры магілёўскіх школьнікаў вучаць з дзяцінства. стар. 4

### «Міс свету» на калясцы



Ці лёгка трапіць ва ўстановы Мінска? стар. 13

### Біягумус і крафтавы напой



На чым яшчэ імкнуцца зарабіць сельскія бізнесмены? стар. 14

### Жыхары супраць аўтапарка



У Драгічыне гараджане незадаволены арганізацыяй пасажырскіх перавозак. стар. 16

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## Напярэдадні форуму

**Намеснік старшыні Савета Рэспублікі, нацыянальны каардынатар па Мэтах устойлівага развіцця Марыяна Шчоткіна сустрэлася з пастаянным каардынатарам ААН у Беларусі Іаанай Казана–Вішнявецкі ў чацвер, 10 студзеня, у Савеце Рэспублікі.**

Як паведамляе афіцыйны рэсурс верхняй палаты беларускага парламента, абмяркоўвалася падрыхтоўка Першага Нацыянальнага форуму па ўстойлівым развіцці, які адбудзецца ў Мінску 24 студзеня.

— Прапаную разам прагаварыць пытанні па арганізацыі і правядзенні форуму, у тым ліку ва ўзаемадзеянні са структурамі ААН. У нас ёсць добрая база, у лютым 2018 года ў Мінску прайшоў Рэгіянальны форум нацыянальных каардынатараў па Мэтах устойлівага развіцця, але наперадзе яшчэ шмат работы, у тым ліку ў рамках новых праектаў па МУР, — падкрэсліла Марыяна Шчоткіна.



Фота БелТА.

У сваю чаргу Іаана Казана-Вішнявецкі адзначыла высокі ўзровень работы, якая праводзіцца ў Беларусі па дасягненні Мэт устойлівага развіцця, і важнасць форуму для далейшага разгортвання гэтай дзейнасці. Яна таксама праінфармавала, што свой удзел у форуме пацвердзіў дырэктар Рэгіянальнага бюро ПРААН па краінах Еўропы і СНД Мірыяне Эгер. Яго візіт у Беларусь стане першым наведваннем нашай краіны на гэтай пасадзе.

У Першым Нацыянальным форуме па ўстойлівым развіцці прымуць удзел прадстаўнікі МЗС, Мінэканомікі, Мінпрацы і сацабароны, Мінэнерга, Мінпрыроды, Нацстата, Нацыянальнай акадэміі навук, ПВТ, прамысловых прадпрыемстваў, вядучых ВНУ, а таксама грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў. Акрамя таго, удзельнікамі мерапрыемства стануць прадстаўнікі агенцтваў ААН і міжнародныя эксперты. Па падліках арганізатараў, форум збярэ каля 400 чалавек.

На форуме будзе прадэманстраваны нацыянальны вопыт Беларусі па дасягненні Мэт устойлівага развіцця. Панэльныя дыскусіі пройдуць па некалькіх тэматычных кірунках: устойлівы эканамічны рост як умова забеспячэння высокага ўзроўню жыцця беларускага народа; забеспячэнне экалагічнай бяспекі, захаванне і ўстойлівае выкарыстанне прыродных рэсурсаў; паляпшэнне якасці жыцця праз здароўе, запатрабаваную адукацыю, годную працу.

Удзельнікі абмяркуюць магчымасці больш эфектыўнага выкарыстання патэнцыялу ўзаемадзеяння грамадства, бізнесу і ўлады для ўстойлівага развіцця, ролю прадпрымальніцтва ва ўстойлівым развіцці рэгіёнаў, перспектывы глабальнага партнёрства ў мэтах устойлівага развіцця. Размова пойдзе аб мерах па барацьбе са зменай клімату, рацыянальным выкарыстанні водных рэсурсаў, эфектыўнай занятасці, пашырэнні правоў людзей з абмежаванымі магчымасцямі, гендарный роўнасці і гэтак далей.

Асаблівая ўвага будзе аддадзена пытанням лічбавізацыі як драйвера эканамічнага росту. Асобна абмяркуюць трансфармацыю энергетычнай сістэмы ў Мэтах устойлівага развіцця. Будуць прадстаўлены нацыянальная платформа справаздачнасці па Мэтах устойлівага развіцця і адпаведныя паказчыкі. Таксама будзе прэзентаваны праект «Садзейнічанне Рэспубліцы Беларусь у нацыяналізацыі і лакалізацыі Мэт устойлівага развіцця».

# ...КАБ ПРЫСТУПКІ НЕ СТАЛІ ПЕРАШКОДАЙ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Асноўныя аб'екты, куды звяртаюцца людзі з інваліднасцю, — гэта ўстановы аховы здароўя. Але, як заявіла на нядаўняй прэс-канферэнцыі **міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ**, усяго толькі 14 % такіх аб'ектаў маюць 100-працэнтную даступнасць. Часткова даступнымі з'яўляюцца 56 % устаноў аховы здароўя, цалкам недаступныя — 20 %.

Па словах Ірыны Касцевіч, гэта ў асноўным будынкі, пабудаваныя ў мінулым стагоддзі, і ў іх вельмі складана цяпер забяспечыць безбар'ернае асяроддзе. «Але мы ўсё роўна кажам пра тое, што над гэтым будзем працаваць», — адзначыла міністр.

Праблема пакуль ёсць і ў сферы адукацыі — недаступнымі застаюцца 51 % аб'ектаў. Не лепш ідуць справы ва ўстановах гандлю і бытавога абслугоўвання. Так што, па словах міністра працы і сацыяльнай абароны, «нас яшчэ чакае вялікі фронт работ па паляпшэнні сітуацыі па стварэнні безбар'ернага асяроддзя ў розных галінах эканомікі».

### Што плануецца?

У Беларусі зараз распрацаваны праект закона «Аб правах інвалідаў і іх сацыяльнай інтэграцыі», гэтай вясной яго плануецца вынесці на абмеркаванне ў парламент. Ён аб'ядноўвае ў сабе палажэнні двух дзеючых законаў: «Аб сацыяльнай абароне інвалідаў у Рэспубліцы Беларусь» і «Аб папярэджанні інваліднасці і рэабілітацыі інвалідаў». Гэта зроблена для таго, каб прывесці наша нацыянальнае заканадаўства ў адпаведнасць з Канвенцыяй аб правах інвалідаў.



Фота БелТА.

**Усяго ў Беларусі па стане на 1 студзеня 2019 года на ўліку ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне маецца 568 тысяч людзей з інваліднасцю (на 1 студзеня 2018 года іх налічвалася 565 тысяч).**

Згаданым праектам закона прапануецца з 2023 года ўстанавіць для наймальнікаў квоту для прыёму на работу інвалідаў. Таму што немагчыма назваць паўнавартаснай адаптацыю і сацыяльную рэабілітацыю людзей з інваліднасцю, калі яны не змогуць працаваць. Для гэтага і будзе існаваць механізм квот. Гэта значыць мясцовыя выканкамамі або дзяржаўнымі праграмамі будзе ўстанаўлівацца мінімальная колькасць рабочых месцаў для людзей з інваліднасцю. Згодна з праектам закона, прадпрымальнікі з інваліднасцю таксама змогуць разлічваць на садзейнічанне з боку мясцовых выканкамаў.

І зноў жа, трэба будзе абсталяваць рабочыя месцы для гэтых людзей, стварыць неабходную інфраструктуру, якая забяспечыць магчымасць руху і гэтак далей. Таму да 1 студзеня 2025 года дзяржаўныя органы і іншыя арганізацыі павінны будуць прыняць неабходныя меры па стварэнні даступнага асяроддзя жыццядзейнасці для інвалідаў. У тых выпадках, калі дзеючыя аб'екты немагчыма цалкам прыстасаваць з улікам патрабаванняў па забеспячэнні даступнасці, згаданым праектам закона прадугледжваецца, што ўласнікі гэтых аб'ектаў да іх рэканструкцыі або капітальнага рамонту абавязаны будуць прымаць узгодненыя з грамадскімі аб'яднаннямі інвалідаў меры для забеспячэння доступу да іх асоб з інваліднасцю.

Маюцца ў праекце закона і нормы аб выдзяленні і выкарыстанні паркавачных месцаў для інвалідаў. Акрамя ўсяго іншага, для гэтай катэгорыі людзей прадугледжана пасля прад'яўлення адпаведнага пасведчання права бясплатнага карыстання аўтамабільнымі паркоўкамі.

**Святлана БУСЬКО.**

РАЗГЛЕДЖАНА НА СЕСІІ

## Памяці славутых гараджан

**У Гродне з'явяцца вуліцы, названыя імёнамі чэмпіёна, краязнаўцы, выдатніка адукацыі і ганаровага будаўніка.**

Такое рашэнне было зацверджана дэпутатамі на мінулай сесіі гарсавета. Вуліцы, якія праектуюцца ў новых кварталах мікраёна Грандзічы, што зараз актыўна забудоўваецца, вырашана назваць імёнамі знакамітых гродзенцаў. Сапраўды, сярод тых, чые прозвішчы з'явяцца на карце абласнога цэнтра, — ганаровыя грамадзяне, лаўрэаты Кнігі славы Гродна, вядомыя жыхары горада над Нёманам, прычым вядомыя не толькі ў ім, але і далёка за яго межамі...

Напрыклад, вуліца № 2, якая праектуецца, атрымае імя двойчы чэмпіёна Алімпійскіх гульняў па цяжкай атлетыцы, ганаровага грамадзяніна горада Аляксандра Курловіча. Вуліца № 8 — імя краязнаўца Віктара Саяпіна, № 10 — выдатніка адукацыі Валянціны Макаравай, а № 29 — ганаровага будаўніка Беларусі Віктара Глухава. Усе ўзгаданыя асобы ў свой час станавіліся лаўрэатамі Кнігі славы Гродна дзякуючы плённым учынкам на карысць любімага горада, актыўнай пазіцыі і шчырай любові да абласнога цэнтра.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

## Даступнасць аб'ектаў для інвалідаў



ЦІКАВЫ ВОПЫТ

# ЯК ВЫЕХАЦЬ З ДОМУ,

## або Дзве гісторыі пра патрэбную справу

## 1. Чаму стварэнне першага ў Гродне інклюзіўнага цэнтра для інвалідаў-калясачнікаў ледзь не завяршылася правалам

**Апошнім часам многія грамадскія арганізацыі ўключыліся ў праектную дзейнасць, якую ініцыюе праграма міжнароднай тэхнічнай дапамогі ААН. Зацікавілася гэтай праграмай і Гродзенская асацыяцыя інвалідаў-калясачнікаў.**

Яны самі ўзяліся за справу пашырэння безбар'ернага асяроддзя. І калі ў рэспубліцы быў аб'яўлены еўрапейскі праект па здаровым ладзе жыцця і прафілактыцы інфекцыйных захворванняў, гродзенцы таксама падалі заяўку. Сваю ініцыятыву назвалі — «Здаровы лад жыцця без абмежаванняў». **Старшыня Гродзенскай абласной асацыяцыі інвалідаў-калясачнікаў Сяргей СЕШЧАНКА** расказаў, што прэтэдэнтаў было больш за сотню. У лік пераможцаў трапілі два праекты нашай асацыяцыі.

— Мы выйшлі з ініцыятывай стварэння першага ў Гродне інклюзіўнага цэнтра для інвалідаў-калясачнікаў, — расказаў Сяргей. — Там плануем праводзіць заняткі па фізкультуры, тэматычныя і культурна-масавыя мерапрыемствы.

Гарадскія ўлады пайшлі насустрач, ідэю падтрымалі. На льготных умовах пад цэнтр выдзелена памяшканне непадалёк ад цэнтральнага стадыёна «Нёман». Многім гродзенцам вядомы гэты будынак па вуліцы Каліноўскага, бо ў ім доўгі час знаходзіўся раённы АВІР, потым быў мэблевы салон. І вось цяпер памяшканне перададзена пад інклюзіўны цэнтр, які ўладкуюць самі інваліды-калясачнікі. Для гэтых мэт за кошт праекта закуплена абсталяванне — спартыўны інвентар, трэнажоры, аргтэхніка, масажная кушэтка для прафілактыкі і лячэння захворванняў пазваночніка.

— Грант прадугледжвае дзесьці 35 тысяч еўра, мы патрацілі толькі палову. Маглі б і больш, але гэта мой першы вопыт — баяўся не ўціснуцца ў бюджэт, — тлумачыць суразмоўнік. — Яшчэ частка гранта пойдзе на арганізацыю першага міжнароднага фестывалю настольнага тэніса сярод інвалідаў-калясачнікаў. Ён, хутчэй за ўсе, адбудзецца сёлета ў маі.

А пакуль ідзе актыўная падрыхтоўка, закуплены тэнісны стол. Трэніравацца гродзенцы змогуць у сваім інклюзіўным цэнтры, дзе ёсць спецыяльны робат, які дапаможа набыць спартыўныя навыкі. Партнерам у правядзенні турніру выступіць упраўленне спорту і турызму аблвыканкама, якое дапаможа ў арэндзе тэнісных сталоў і іншага інвентару. Само спаборніцтва разгорнецца на стадыёне «Неман».

Гэта зараз Сяргей Сешчанка можа спакойна расказваць аб сваім праекце і яго выніках. А зусім нядаўна ён ледзь не кінуў гэтую ідэю. Цяжка было яму, навічку, разабрацца ў складанай дакументацыі і патрабаваннях да праекта. Не было памочнікаў, якія б ведалі гэтую справу і афармілі б усё належным чынам. А бар'еры ўзнікалі, здавалася б, на роўным месцы.

— На мясцовым узроўні перашкод не было, а вось на ўзроўні Міністэрства эканомікі ўзнікалі непаразуменні, — расказвае Сяргей. — Як вядома, у праектах ёсць усталяваныя формы, стандарты, якія трэба абавязкова выконваць. З-за дробязяў даводзілася некалькі разоў перапісваць праект, каб ён адпавядаў патрабаванням камісіі, а не міністэрства.

Праблемы ўзнікалі і з афармленнем бюджэтнага плана. Нават пры закупках такіх рэчаў, як фарба, эмаль, сантэхнічныя прылады, здаралася блытаніна. То нумар вытворцы не ўказаны, то нумар вырабу. На думку Сяргея, выбрацца з гэтай блытаніны і бюракратычнай цяганіны можна толькі з вельмі моцнай псіхікай.

Трымала і мэта. Як-ніяк з дапамогай праекта ў горадзе з'явіцца першы цэнтр для інвалідаў-калясачнікаў, а гэта значыць, будзе зробены яшчэ адзін крок да інтэграцыі людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Зараз памяшканне на стадыі завяршэння капітальнага рамонту, ужо ёсць абсталяванне. Заняткі будуць бясплатныя не толькі для інвалідаў-калясачнікаў, але і для іх сяброў, і родных.

Справа сапраўды патрэбная. У Гродне, па словах Сяргея, каля 500 інвалідаў-калясачнікаў. А ўсяго па вобласці каля шасці тысяч чалавек, якія прыкаваны да інваліднага крэсла. Дзякуючы такім праектам многія змогуць пашырыць межы свайго свету і знайсці цікавы занятак.

## 2. Пераадолець бар'ер у сабе

### Пра вандроўніка, які распачаў інклюзіўны праект

**Два гады таму пра Аляксандра Аўдзевіча пісалі многія СМІ, яго здымалі для выпускаў тэлепраграм, размяшчалі інфармацыю на сайтах у інтэрнэце. І не дзіва, бо Аляксандр, які перасоўваецца на інвалідным крэсле, змог на самаробным байку амаль за 90 дзён аб'ехаць палову Еўропы. У цяперашні час Саша заняты чарговым інклюзіўным праектам, які распачала Лідская міжраённая арганізацыя інвалідаў-калясачнікаў.**

На думку **Аляксандра АЎДЗЕВІЧА, які ўзначальвае рэгіянальнае аддзяленне беларускай рэспубліканскай асацыяцыі інвалідаў-калясачнікаў (РАІК)**, менавіта людзі з абмежаванымі магчымасцямі павінны больш актыўна заняцца сваёй сацыялізацыяй і інтэграцыяй. Бо перш-наперш варта пераадолець бар'ер ва ўласнай свядомасці. І з гэтым ёсць пэўныя праблемы, лічыць суразмоўнік. Далёка не ўсе калясачнікі імкнуцца да салідарнасці і згуртаванасці ў сваім становішчы. Таму Саша, як можа, сам стараецца выступіць ініцыятарам многіх сацыяльных праектаў. Яго галоўная мэта — стварэнне безбар'ернага асяроддзя і паляпшэнне якасці жыцця. Дзякуючы яго намаганням у Лідзе з'явілася безбар'ерная пляжная зона. Рэалізаваны праект па інклюзіўным кінатэатры. З дапамогай МТБ-банка ён арганізаваў пандус у доме, дзе жыве дзяўчына-калясачніца. Вядомы яго праект-школа «Інклюзіўны барыста», дзе на базе кафэ Гродзенскай вобласці праходзяць навучанне прафесіі інваліды-калясачнікі. Адна з дзяўчат ужо працаўладкавана.



Каб заявіць аб праблемах людзей у інвалідных крэслах, Саша два гады таму здзейсніў самастойнае падарожжа па Еўропе на самаробным ручным байку, праехаў на ім каля трох тысяч кіламетраў і пабываў у 13 краінах. Ён прымусіў гаварыць пра сябе і гэтым самым зрабіў яшчэ адзін крок да інтэграцыі, бо калі калясачнік здолеў такое, дык як яго можна лічыць чалавекам з абмежаванымі магчымасцямі?

Чарговы праект Сашы мае назву «Інклюзіўны кросфіт» і рэалізуецца ў рамках ПРААН, як і праект у Гродне. Яны падобныя, але ў Лідзе большы акцэнт робяць менавіта на зону фізічнага развіцця. Як зазначыў сам Аўдзевіч, гэта сацыялізуе і пашырае кола ўдзельнікаў, умацоўвае іх фізічны стан, надае спартыўны дух. Для гэтых мэт дзіцячая спартыўная школа аддае «сухую» залу басейна «Дэльфін».

— Тут будзе комплекс турнікоў, гумовае пакрыццё, — расказвае Аляксандр. — Галоўная ідэя ў тым, каб далучыць да трэніровак людзей з інваліднасцю. Мы ставім мэту ўдзельнічаць у розных спаборніцтвах, бо будзем накачаныя, натрэніраваныя, дужыя.

Будаўнічая брыгада хутка пачне аднаўляць залу, але перш за ўсё тут будзе зроблены невялічкі пандус каля ўвахода. Саша спадзяецца, што зала не стане пуставаць. Сам ён актыўна займаецца на трэнажорах, наведвае басейн. У яго ёсць мара — стварыць каманду па парабапслеі. Нядаўна ён пабываў на зборах у Аўстрыі і вельмі захапіўся гэтым відам спорту. Праўда, сваёй федэрацыі парабабслея ў нашай краіне няма, але Саша ўпэўнены, што робяцца захады для яе рэгістрацыі. Ён нават гатовы прыняць удзел у спаборніцтвах.

> Мы ставім мэту ўдзельнічаць у розных спаборніцтвах, бо будзем накачаныя, натрэніраваныя, дужыя.

...Вядома, не магла не пацікавіцца, што стала з тым самым хэндбайкам, на якім хлопец аб'ехаў палову Еўропы. Аказваецца, тэхнічны сродак праходзіць удасканальванне. Саша хоча замяніць канструкцыю, зрабіць яго больш манеўраным і лёгкім. І што вельмі істотна, пазбавіцца матора, перайсці поўнасцю на ручное кіраванне. Пакуль што новых вандровак Саша не плануе, бо зараз ёсць справы ў родным горадзе. У першую чаргу трэба завяршыць праект па кросфіце. Працягне сваю працу і школа інклюзіўных барыста. Сёлета праект пераедзе за межы рэгіёна і накіруецца ў Магілёў.

Саша не спыняецца ў сваёй грамадскай дзейнасці. Ён бачыць сваю мэту яшчэ і ў тым, каб парушыць бар'еры ў свядомасці людзей з інваліднасцю, матываваць іх выязджаць з дому, са сваіх куткоў і свайго маленькага свету.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

## і фізічна аслабленых асоб па галінах



# УРОКІ МІЛАСЭРНАСЦІ



**— Мы ўжо не адно пакаленне дзяцей выхоўваем на міласэрнасці, — усміхаецца завуч школы № 19 Ірына КАРАВАЦКАЯ. — Яшчэ з іх бацькамі калісьці шэфствавалі над тутэйшымі пенсіянерамі, добраўпарадкоўвалі тэрыторыю, саджалі дрэвы... Наша Казіміраўка ўскраіна Магілёва, горадам яна стала толькі ў 80-я гады. Гэта зараз тут шматпавярховікі, а тады былі спрэс прыватныя падворкі — вёска адным словам...**

## «ХТО, КАЛІ НЕ МЫ...»

Дзевятнаццатая школа ў Магілёве па памерах амаль аграгарадок, тут вучыцца болей за 1200 школьнікаў. Сёлета ў мікраранёне павінна з'явіцца яшчэ адна школа, але пакуль увесь цяжар па адукацыйным і выхаваўчым працэсе мясцовых падлеткаў цалкам ляжыць на гэтай установе. І яна спраўляецца. Нават з поспехам. Ірына Каравацкая, а яна яшчэ і намеснік старшыні Савета па мясцовым самакіраванні мікразоны № 12, прызнаецца, што ў гэтым дапамагае шматгадовы вопыт па рабоце з грамадскасцю. За некалькі дзясяткаў гадоў пры яе непасрэдным удзеле рэалізавана безліч ініцыятыў. У тым ліку і па безбар'ерным асяроддзі. На стале завуча папка з подпісам «Хто, калі не мы». Гэта вялікі сацыяльны праект, які летась быў рэалізаваны саветам.

— У Магілёве праходзіў кірмаш сацыяльных праектаў, і мы таксама прымалі ўдзел, — Ірына Сяргееўна дэманструе старонку ёмістага «талмуда» з цікавым малюнкам. На ім пазлы з назвамі ініцыятыў — кожная паступова пераходзіць у іншую. Вось, напрыклад, «Рабіць дабро — проста» — пад такім лозунгам адбыўся шэраг акцый па добраўпарадкаванні. З дапамогай ініцыятывы «Здароўе — радасць жыцця» папулярызаваліся заняткі спортам. Пры школе працуюць секцыя каратэ і танцавальны клуб, вельмі развіты ў мікразоне рух аматараў скандынаўскай хады, дзе актыўныя ўдзельнікі пенсіянеры. Школа сябруе з праваслаўным храмам Іконы Божай маці Усецарыцы, які знаходзіцца непадалёк. Разам з айцом Георгіем адкрылі праваслаўную гасцёўню, дзе адбылася акцыя «Цяпло душы». Настаўнікі і школьнікі актыўна дапамагалі тым, хто асабліва мае ў гэтым патрэбу. А «Жыць здорава» — ініцыятыва, якая садзейнічае ўмацаванню сувязяў паміж жыхарамі дома, двара, мікразоны. Гэта сумесныя святы, акцыі міласэрнасці. А нядаўна ў школе вырашылі пачаць вучыць пенсіянераў камп'ютарнай адукаванасці.

— Мы жывём гэтымі праектамі, — кажа завуч. — Прыемна, што ў школе працуе столькі неабыякавых людзей. Мой лёс звязаны з гэтым мікраранам з 1972 года, на маіх вачах адбываюцца вялікія змены.

## КНІГІ ДОБРЫХ СПРАЎ

Яны саромеюцца расказваць пра свае добрыя справы, лічаць, што ў гэтым няма нічога асаблівага. Усіх іх аб'ядноўвае атрад «Міласэрнасць». Яго ўдзельнікі — старшакласнікі, пачынаючы з дзявятага класа. Гэта ўжо вопытныя валанцёры, якія прымаюць удзел у шматлікіх дабрачынных акцыях. Атрад супрацоўнічае з аддзяленнем Чырвонага Крыжа Ленінскага раёна Магілёва.

— Вось сёння ездзілі ў Дом дзіцяці, завезлі туды шмат падарункаў, — удакладняе **педагог-арганізатар Ірына ДАВЫДАВА,** якая каардынуе работу членаў БРСМ. — Актыўных удзельнікаў дабрачынных акцый уключаем у наш валанцёрскі атрад. З гэтага года ўручаем ім валанцёрскія кнігі, дзе пазначаны і завераны подпісам дырэктара і пячаткай усе добрыя справы.

За школай замацавана 15 дзяцей-інвалідаў да 18 гадоў. Некаторыя яшчэ ў дзіцячым садзе, але сацыяльныя педагогі ўжо падрыхтавалі іх спіс. Так лягчэй прааналізаваць, што каму патрэбна. Збіралі для іх цацкі, канцылярскія прылады, сродкі гігіены.

Уладзіслаў ужо выпускнік школы, яму 22 гады. Але яму тут усё роўна дапамагаюць. У маладога чалавека цяжкае захворванне і патрэбны дарагія лекі.

— Ён вучыўся ў пятым класе, калі разам з бацькамі пераехаў у наш мікрараён, — расказвае Ірына Каравацкая. — Менавіта тады аднакласнікі з класным кіраўніком Наталляй Марачкоўскай першы раз прыйшлі да яго на Новы год з падарункамі — купілі гранатавы сок, фрукты. І потым яшчэ неаднаразова наведвалі. У школу ён не хадзіў, вучыўся дома. Мы перыядычна збіралі грошы і пераводзілі яму на рахунак, каб маці купіла неабходныя лекі. Зараз вось рыхтуем чарговую матэрыяльную дапамогу.

## ДАШЫНЫ СЯБРОЎКІ

Пандусы, поручні, спецыяльныя прыстасаванні робяць жыццё асаблівых людзей зручнейшым, але не шчаслівейшым. Ім патрэбна ўвага, адчуванне сяброўскага пляча. Выхаванне міласэрнасцю пачынаецца ў школе змалку. У кожным класе ёсць невялічкія атрады з аналагічнай назвай. Яны дапамагаюць змагацца аднагодкам з псіхалагічнымі «бар'ерамі».

У шасцікласніцы Дашы цяжкая форма скаліёзу, яна не можа наведваць школу. Але аднакласнікі не пакідаюць яе ў самоце, прыходзяць у госці.

— На выгляд яна іншая, але ў душы такая ж, як і мы, — прызнаецца Карына Слюсар. — З ёй вельмі весела і цікава. Нам не цяжка знайсці агульную мову.

— Дома ў яе жыве прыгожае кацяня, яна вельмі любіць жывёл, — адзначае Ксюша Швайкова.

— Мы перапісваемся з ёй у сацыяльных сетках, трымаем у курсе нашых спраў, — уключаецца ў размову Лера Рымкевіч.

— Пытаемся пра самаадчуванне, чым яна займаецца, што яе непакоіць. Яна вельмі жыццярадасная. Вельмі любіць маляваць і можа зрабіць складаную гімнастычную фігуру, напрыклад, сесці на шпагат. Яшчэ не кожная з нас так умее, — дадае Карына Балобіна.

Даша, дарэчы, паўнавартасная ўдзельніца школьнага жыцця, з'яўляецца членам піянерскай арганізацыі.

## НОЎТБУК ДЛЯ РАМАНА

Хлопчык анкахворы. Настаўнікі дэманструюць кранальнае фота, дзе ён, цалкам лысы пасля перанесенай ім хіміятэрапіі, сядзіць з ноўтбукам. Грошы на шчодры падарунак збіралі ўсёй школай.

— Сродкі немалыя, але бацькі не засталіся ўбаку, удзельнічалі разам з намі, — кажа завуч. — Некаторыя спачатку адмаўляліся, маўляў, шмат такіх хворых. Але, калі ўбачылі фота Рамана, усе пытанні самі па сабе зніклі.

ПУНКТ ГЛЕДЖАННЯ

# ПАНІЖАНЫ БАРДЗЮР І ЗАНЯТАЯ ПАРКОЎКА

**Валянціна Піпко шмат гадоў узначальвае фізкультурна-спартыўны клуб інвалідаў «Шанс» у Брэсце. Яна вядомы ў горадзе чалавек, яе мэтанакіраванасць і актыўная жыццёвая пазіцыя дапамаглі шмат зрабіць для рэабілітацыі інвалідаў. Валянціна Мікалаеўна — інвалід І групы, з цяжкасцямі, якія пераследуюць людзей з абмежаванымі магчымасцямі, сутыкаецца ў паўсядзённым побыце, праблему ведае не па чутках. З ёй мы і абмяркоўваем магчымасць весці нармальнае жыццё ў гарадскім асяроддзі для інваліда-калясачніка.**

## Хібы ў выкананні законаў

Валянціна Піпко пачала з таго, што дзяржава апошнім часам зрабіла вельмі шмат для стварэння сапраўднага безбар'ернага асяроддзя. Тое, што было ў савецкі час і зараз — неба і зямля. Галоўныя захады зробленыя на заканадаўчым узроўні: прынятыя адпаведныя нормы, нарматывы, патрабаванні, выдзелены сродкі. Але, як нярэдка ў нас бывае, з выкананнем законаў узнікаюць праблемы. Маленькія недапрацоўкі на месцах, неапраўданая эканомія альбо элементарны недагляд пры будаўніцтве здольныя абярнуцца для канкрэтных людзей забаронай на простыя дзеянні. І, здараецца, абарочваюцца сапсаваным настроем, слязамі, а то і рэальнымі праблемамі.

— Ну вось, скажам, на любой паркоўцы прадугледжана месца для інвалідаў. І на любой яно бывае, як правіла, занятае, — разважае **Валянціна ПІПКО.** — Як з гэтым змагацца? Чакаць пакуль перастроіцца свядомасць людзей? Але гэтага можна дабіцца пры ўмове выхавання чалавека з самага ранняга ўзросту, значыць, не менш, чым праз пакаленне. Выхадам бачацца меры адміністрацыйнага ўздзеяння. Так, дарожная міліцыя праводзіць рэйды, скажам, напярэдадні міжнароднага дня інвалідаў. Але ж гэта варта рабіць часцей, ну хоць бы раз на месяц. Як чалавек за нейкае парушэнне адкажа рублём, то апошняе нават калі не зменіць разуменне, яно застанецца ў памяці. Думаю, што еўрапейцы дабіліся жаданага становішча не толькі выхаваннем, але і штрафамі. Там яны, дарэчы, вельмі вялікія.

## Непераадольная перашкода

Ну і самая вялікая праблема для людзей з абмежаванымі магчымасцямі ў перасоўванні — паніжаныя бардзюры. Такое ўражанне, што з кожнай новай будоўляй мы наступаем на адны і тыя ж граблі. Аўтар гэтых радкоў мела магчымасць назіраць падобныя будаўнічыя хібы, бо побач з карпунктам некалькі гадоў працягваюцца маштабныя будоўлі. Спачатку ўзводзілі вялікі офіс падатковай службы, цяпер ідзе рэканструкцыя кобрынскага моста. Дык вось падатковую здалі, добраўпарадкаванне зрабілі, новыя дарожкі праклалі, у тым ліку з боку моста. А ў напрамку вуліцы Малой паставілі такія высокія бардзюры, што і здароваму чалавеку іх не вельмі лёгка пераадолець, калі пераходзіш дарогу. Потым, вядома, перарабілі, змарнаваўшы сродкі.

Валянціна Мікалаеўна прывяла прыклад новага будынка агенцтва па нерухомасці і зямельным кадастры, якое па звычцы ўсе называюць БТІ. Там проста шыкоўнае безбар'ернае асяроддзе: пандусы, месцы для паркоўкі, поручні спецыяльныя. Але ў гэтае самае асяроддзе інвалід проста трапіць не можа. Бо вакол — аніводнага паніжанага бардзюра. То-бок выйшаў з машыны, перасеў у каляску... і можаш вяртацца дадому, калі пасаромеешся прасіць некага аб дапамозе. Укладзена шмат сродкаў, а нейкая дробязь перакрэслівае намаганні стольках людзей. Тое ж самае назіраецца ў адным з найбуйнейшых гандлёвых цэнтраў «Вам рад», паніжаных бардзюраў няма. Нават на чыгуначным вакзале, куды можна дэлегацыі вадзіць па вывучэнні гэтага самага безбар'ернага асяроддзя, не прадугледзелі пад'езд для калясак на аўтастаянцы з выхадам на цэнтральны перон.

На жаль, яшчэ часта пры правядзенні добраўпарадкавання менавіта ў парушэнне праектаў «забываюць» зрабіць паніжаны бардзюр — самае важнае для чалавека ў калясцы. Потым даводзіцца перарабляць, укладваць сродкі наноў і выпраўляць хібы канкрэтнага чалавека: майстра альбо прараба. Вось вам той самы чалавечы фактар, карані якога хаваюцца ў перажытку савецкага мінулага — установцы, што інвалідаў у нас няма. Можа, трэба абавязаць тых, хто прымае аб'екты, прайсці дадатковы курс лекцый — гаварылі ў клубе.

Што датычыцца гандлю, то інваліды ў цэлым задаволеныя абсталяваннем яго аб'ектаў. У кожным раёне горада ёсць супермаркет альбо нават гіпермаркет буйной гандлёвай сеткі, які цалкам прыстасаваны для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Паводле ацэнкі Валянціны Піпко, нельга зрабіць такімі ўсе магазіны. Але ж выбраць нейкую з крам пакупнік у калясцы заўсёды зможа.

## Інвалід у палаце

Застаецца пытанне па медыцынскіх установах. Цяпер там ёсць пандусы, абсталяваныя заезды, шмат чаго зроблена для зручнасці, укладзеныя немалыя сродкі. Але ніводзін стацыянар не аснашчаны спецыяльнымі туалетамі для інвалідаў. Скажам, паступае чалавек на лячэнне ў аддзяленне і сутыкаецца з сітуацыяй, калі на калясцы ў туалет проста не патрапіш, бо там вузкія дзверы, няма патрэбных прыстасаванняў. Вядома, пацыент пачынае задаваць пытанне, і санітарка прыносіць адпаведныя пасудзіны. Гэта значыць, чалавеку прапаноўваюць спраўляць патрэбу ў палаце пры ўсіх. Для асобных людзей гэта абарочваецца сапраўдным стрэсам, няцяжка ўявіць. «Лічу, што праблему трэба вырашаць, — гаворыць Валянціна Мікалаеўна. — Інвалідам па стане іх здароўя часта даводзіцца праходзіць курс лячэння. І яны павінны мець падчас знаходжання ў стацыянары нармальныя санітарныя ўмовы. Гэта не значыць, што варта ўладкоўваць асобны туалет для інвалідаў. Дастаткова ў любым туалеце аддзялення зрабіць шырокія праёмы і дадатковыя поручні».

## Бар'еры — у галовах

У Брэсце інвалід-калясачнік без асаблівых праблем трапіць ва ўстановы грамадскага харчавання. Можа ён знайсці для сябе аддзяленне банка, цырульню, пошту. А вось ва ўстановы культуры часта дарога такому чалавеку фактычна закрытая. Самае большае, што ёсць, пандусы. Але з дапамогай пандусаў заедзеш у лепшым выпадку ў фае. Далей — праблемы. Новы лялечны тэатр, які ўзводзіцца, будзе зроблены з улікам цяперашніх патрабаванняў. А драматычны тэатр, кінатэатры пабудаваныя даўно, яны яўна не разлічаныя на людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

Размову працягваем з трэнерам клуба «Шанс» Дар'яй Міхнюк. Яна па родзе дзейнасці часта выязджае са спартсменамі-калясачнікамі за мяжу на спаборніцтвы, зборы. Мае магчымасць параўноўваць. Дар'я лічыць, што праблема ў свядомасці здаровых членаў грамадства, і паступова яна мяняецца да лепшага. Але там, за мяжой, людзі больш праяўляюць спагады. Нават на мяжы і мытні з суседняга боку гэта ўжо адчуваеш. Там на дапамогу прыйсці імкнецца не толькі службовая асоба, але і кожны выпадковы чалавек. У нас таксама ёсць шмат чулых, нераўнадушных, але ёсць і іншыя прыклады. Маецца на ўвазе не толькі прахожы, які не прытрымаў дзверы, але і кіраўнік, які адмовіў у прыёме на работу. Трэба рухацца ў напрамку змены свядомасці. Бар'еры часта знаходзяцца ў нас саміх. Іх пераадольваць цяжэй за ўсё.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Тэлесеткі

# Не штука — навука, а штука — розум

**Папулярны праект — віктарына для ўсёй сям'і «Я ведаю!», зладжаная сумесна Белтэлерадыёкампаніяй і Міністэрствам адукацыі, вяртаецца ў эфір канала «Беларусь 1». Ужо 12 студзеня «знайкі» з усёй краіны — школьнікі, якія прайшлі папярэдні адбор у сваіх раёнах і абласцях, адкрыюць захапляльныя інтэлектуальныя спаборніцтвы.**




Як і ў мінулым сезоне 2017/18 года, спачатку свае веды прадэманструюць эрудыты з асобна ўзятай паралелі — з 5 па 11 клас, а экзаменаваць і разам з тым падтрымліваць удзельнікаў будуць Георгій Калдун, за пультам вядучага, і Дзмітрый Новік — з педагогамі ў «настаўніцкай». Вучні сярэдніх і старшых класаў, якія набяруць найбольшую колькасць балаў, працягнуць барацьбу ў суперфіналах, а пераможцаў у кожнай паралелі чакаюць дыпломы і падарункі-сюрпрыз для ўсяго класа.

У медыяхолдынгу «Звязде» расказалі, што шоу-віктарына, якая летась мела высокія рэйтынгі і станоўчыя водгукі гледачоў, крыху пашырылася — па-першае, выходзіць у эфір яна цяпер будзе двойчы на тыдзень, па суботах і нядзелях, а па-другое, акрамя вундэркіндаў, у кожным выпуску прадставяць шырокай публіцы таленавітых дзяцей з рэгіянальных школ мастацтваў.

«Я заўжды папярэджваю дзяцей, што пытанні ў нас вельмі розныя — як надзвычай складаныя, на якія не кожны дарослы адказа, так і самыя простыя, — гаворыць **вядучы шоу-віктарыны «Я ведаю!» Георгій КАЛДУН.** — У працэсе абмеркавання стараюся разгаварыць кожнага ўдзельніка, каб зразумець: ён ведае правільны адказ проста таму, што завучыў яго, альбо разбіраецца ў прадмеце і можа лагічным шляхам растлумачыць свае высновы. Калі ніхто не ведае адказу, мы з Дзімам Новікам часта звяртаемся да настаўнікаў, або я прашу падняць рукі тых гледачоў у зале, хто ведае адказ, — і дзеці бачаць, што гэта не яны такія някемлівыя, а пытанне насамрэч такое мудрагелістае. І, натуральна, я таксама ніколі не саромеюся прызнавацца, што часцяцы не ведаю, і буду ўдзячны, калі нехта падкажа і растлумачыць».

Некаторыя ўдзельнікі, дарэчы, паспрабуюць свае сілы ўжо другі раз, многія таксама спецыяльна глядзелі мінулы сезон праграмы, каб лепш падрыхтавацца да інтэлектуальных іспытаў. У каго гэта атрымалася і як далёка маглі б прасунуцца ў віктарыне вы — глядзіце і правярайце па суботах і нядзелях у 13.30.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 60

Наступная двухходоўка Мікалая Бельчыкава і Міхаіла Кошаля заняла другое месца ў камандным першынстве Беларусі 2018 года ***(гл. дыяграму)***.



**Белыя:** Kph3, Фb7, Лf2, Cc6, Ce5, Kg5, Kg8, пп. f4, g2, h5 (10).

**Чорныя:** Kpf5, Фc5, Ca5, Ch7, Kc4, Kh2, пп. d5, d7, e3, e4, e6, g7 (12).

Мат у 2 хады.

Дасылайце рашэнні на адрас рэдакцыі (вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, «Звязда») або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru.

* * *

У «паўночнай сталіцы» Расіі, горадзе на Няве, прайшлі чэмпіянаты свету сярод мужчын і жанчын па хуткіх шахматах (рапідзе) і бліцы. Пра выстрыню барацьбы сведчыць той факт, што дзеючы чэмпіён свету па класічных шахматах Магнус Карлсен фінішаваў у рапідзе (206 удзельнікаў) на пятым месцы, прайграўшы на дыстанцыі ў 15 тураў тры партыі (16-гадоваму ўзбекскаму шахматысту Ш. Вахідаву, украінскім гросмайстрам А. Зубаву і А. Тухаеву). З беларусаў найлепшы вынік паказаў Сяргей Жыгалка — 42-е месца, 9 ачкоў з 15. Віталь Цецераў (7 ачкоў), Уладзіслаў Кавалёў і Андрэй Жыгалка (па 6,5) фінішавалі ў другой сотні. А чэмпіёнскі тытул у рапідзе заваяваў расійскі гросмайстар Данііл Дубаў.

Што праўда, М. Карлсен узяў рэванш у бліцы (202 удзельнікі) — першае месца (13 перамог і 8 нічыіх). Сярод тых, хто здолеў згуляць з ім унічыю, быў і Сяргей Жыгалка. І зноў жа найлепшы вынік з беларусаў у С. Жыгалкі — 24-е месца, 13 ачкоў з 21, а У. Кавалёў (9,5 бала), А. Жыгалка (9) і В. Цецераў (8) — у другой сотні.

У жанчын у рапідзе (124 удзельніцы) перамагла дзеючая чэмпіёнка свету па класічных шахматах Цзюй Вэньцзюнь (Кітай). Але ў бліцы (125 удзельніц) кітаянка падзяліла толькі восьмае месца, а перамогу святкавала расіянка Кацярына Лагно, віцэ-чэмпіёнка свету па класічных шахматах. Беларускія шахматысткі Ланіта Сцяцко і Вольга Бадэлька выступілі не вельмі ўдала: у рапідзе яны набралі адпаведна 5,5 і 5 ачкоў з 12, у бліцы — 5,5 і 8 з 17.

* * *

У мінулым выпуску мы расказвалі пра выступленне беларускай каманды на сусветнай юнацкай Алімпіядзе (да 16 гадоў). Вось яшчэ дзве перамогі нашых шахматыстаў на ёй.

Вольга Бадэлька — Нікалозі Качарава (Грузія). 1.d4 d6 2.e4 Kf6 3.f3 e5 4.d5 c6 5.c4 Фb6 6.Kc3 Cd7 7.Фe2 Ka6 8.Ce3 Kc5 9.Фd2 cd 10.cd Лc8 11.Лb1 a5 12.Kge2 a4 13.Kc1 Фb4 14.Kd3 K:d3+ 15.C:d3 Kh5 16.g3 Ce7 17.Kb5 Ф:d2+ 18.Kp:d2 g6 19.Лbc1 0-0 20.Ka7 Л:c1 21.Л:c1 Cd8 22.Kb5 C:b5 23.C:b5 f5 24.Kpe2 fe 25.fe Kf6 26.Ch6 a3 27.b4 K:e4 28.Лc8 Ce7 29.C:f8 C:f8 30.Cd3 Kf6 31.Лb8 Kpf7 32.Л:b7+ Kpe8 33.Cb5+ Kpd8 34.Лb8+ Kpe7 35.Cc6 Ke4 36.Kpd3, 1:0.

Вячаслаў Зарубіцкі — Судэ Герэклёглу (Турцыя). 1.e4 c5 2.Kf3 e6 3.d4 cd 4.K:d4 a6 5.c4 Kf6 6.Kc3 d6 7.Ce2 Ce7 8.0-0 0-0 9.Ce3 Фc7 10.Лc1 Kbd7 11.f3 b6 12.b4 Cb7 13.a3 Лac8 14.Фe1 Лfe8 15.Фf2 Фb8 16.g4 Ke5 17.g5 Kfd7 18.Ka4 Фa8 19.Фg3 d5 20.cd ed 21.f4 Kc4 22.e5 b5 23.Cg4 Лcd8 24.Kc3 Kdb6 25.Cf2 Kd2 26.e6 fe 27.Фh3 Cc8 28.Лfd1 Kbc4 29.K:e6 C:e6 30.C:e6+ Kph8 31.g6 h6 32.Ф:h6+ gh 33.Cd4+, 1:0.

* * *

На турніры ў Пецярбургу Валерый Казакоўскі падзяліў 1—3 месцы (па дадатковых паказчыках ён другі), а Віталь Цецераў быў пяты. У Рызе (66 удзельнікаў) Юры Ціханаў заняў шостае месца, Арцём Сіняўскі — дзясятае. Рахіль Эйдэльсон фінішавала пятая на жаночым турніры ў Чалябінску. А ў чылійскім горадзе Арыка Кірыл Ступак быў дзясяты са 127 гульцоў.

* * *

Рашэнне задачы з мінулага выпуску: 1.a7. Першымі правільна адказалі Уладзімір Ізотаў, Ігар Ананіч, Васіль Жуковіч, Сяргей Цяльпук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

# ЗАПАЛКІ ЗАКАЗВАЛІ?

**40 гадоў таму на «Масфільм» прыйшоў загад, што называецца, з самага верху: зняць разам з фінскімі калегамі поўнаметражную мастацкую кінастужку. Фіны прапанавалі экранізаваць аповесць «Па запалкі», напісаную фінскім жа класікам Альготам Унтолам у 1910 годзе пад жаночым псеўданімам Маю Ласіла.**



...Жонка Анці Іхалайнена адправіла мужа да суседа папрасіць запалак, якія раптам скончыліся, а таму немагчыма зварыць любімай кавы. Гісторыя на тым і завяршылася б, каб Анці не сустрэў па дарозе старога прыяцеля Юсі Ватанена ды не пачаў сватаць за яго суседскую дачку. Ушчэнт забыўшыся на запалкі, сябрукі паехалі ў горад купляць падарункі нявесце ды цесцю, незаўважна парушылі 10-гадовы зарок не ўжываць спіртнога і пад хмяльком пажартавалі, сказаўшы вядомаму на ўсю ваколіцу плеткару, нібыта едуць у Амерыку, — і гэтая пагалоска хутка дайшла да жонкі Іхалайнена, якая ўжо хваявалася, дзе муж і дзе, уласна, запалкі. Далей перамяшаліся адметныя рысы нацыянальнага характару, нецвярозыя прыгоды, камедыя палажэнняў, карацей, — усе складнікі добрай і забаўнай гісторыі з хэпі-эндам.



Суайчыннікі фінскага класіка экранізавалі аповесць «Па запалкі» ў 1938-м, з 1951 года яе ведалі савецкія грамадзяне — у перакладзе пісьменніка-сатырыка Міхаіла Зошчанкі. Для сумеснага праекта вырашылі падзяліць ролі — не па-братэрску, а пароўну — паміж фінскімі і савецкімі акцёрамі, а таксама прызначыць па адным рэжысёру з кожнага боку. Ад СССР у працу ўключыўся Леанід Гайдай, якому вельмі спадабаўся сюжэт будучай карціны. Фінляндыю ж прадставіў гендырэктар «Суомі-фільм» Рысто Орка, для якога гэта работа стала апошняй.

«Суомі-фільм» абавязаўся аснасціць здымачную групу якаснай апаратурай, уключаючы апераатарскі аўтамабіль, кран, пераносныя запісвальныя прыборы. Нават касцюмы для сваіх акцёраў фіны шылі самі. Тым больш дзіўна, што падчас пераговораў «Масфільм» дамогся кольскай перавагі — цэнтральныя мужчынскія ролі атрымалі савецкія акцёры, а фінскім дасталіся дзве жаночыя ролі (іх выканалі Рыта Полстэр і Рытва Валкама) і ўсе эпізоды. Так, ролю Іхалайнена сыграў Яўген Лявонаў, на ролю Ватанена праходзілі пробы Данатас Баніёніс, Леанід Кураўлёў — а атрымаў Вячаслаў Нявінны. Шаўца Кенанена, закаханага ў жонку галоўнага героя, маглі сыграць Уладзімір Басаў, Барыслаў Брандукоў, Ралан Быкаў, Георгій Буркоў і Ігар Ясуловіч, але пашанцавала Георгію Віцыну, якога, зрэшты, сцэнарна-рэдакцыйная калегія ўпікала ў празмернай эксцэнтрычнасці. У іншых ролях адзначыліся Галіна Польскіх, Ніна Грабяшкова, Леанід Кураўлёў, Міхаіл Пугаўкін і Сяргей Філіпаў, тэст за кадрам чытаў Аляксандр Шырвінт.

Здымкі праходзілі ў павільёнах «Масфільма» і ў фінскім горадзе Порваа, брукаваныя вуліцы і драўляныя домікі якога сталі выдатнымі дэкарацыямі для «шумнага, мітуслівага і загадкавага» кінагорада Ёкі.

Стужка выйшла праз год, акурат да 25-годдзя асаблівых стасункаў СССР і Фінляндыі, у двух варыянтах: фінскім і рускім — прычым другі карацейшы, затое ў ім гучаць арыгінальныя песні, напісаныя Аляксандрам Зацэпіным і Юрыем Энціным — «Чёрт-те что и сбоку бантик», напрыклад, спяваюць самі акцёры Вячаслаў Нявінны і Яўген Лявонаў, а «Як добра ўзняцца ў абалокі» гучыць у выкананні Іосіфа Кабзона.

У савецкім кінапракаце 1980-га фільм заняў 11-е месца па наведвальнасці: яго паглядзелі звыш 34 мільёнаў чалавек. А фінскім гледачам і крытыкам так спадабаўся Яўген Лявонаў, што яго абралі ганаровым удзельнікам Тэатральнага таварыства Фінляндыі!

Нават праз 40 гадоў старая добрая камедыя «Па запалкі» не спісаная ў запас — 20 студзеня яе пакажа тэлеканал АНТ.

**Сказана!**

«Адкуль у цябе гэтае парася? — Ад свінні».

«Некалькі глыткоў не ператвораць разумнага чалавека ў дурня».

«Гэта ж лішняя раскоша — трымаць ложак пяць пустым. — Ды не, лепш няхай ложак будзе пустым, чым запаўняць яго ўсякай набрадзю».

«Накомт штаноў я здарова знакаміты!»

«Сам утапіўся ў моры, а сам жыць працягвае...»




# Ілбом сцяну не праб'еш, але выцяцца можаш

**Свой, адметны чытач у газеты «Звязда». Ён жа, хочацца верыць, глядач тэлеканала «Беларусь 3» і ў прыватнасці праграмы «Размаўляем па-беларуску». Гэтая тэлевіктарына ўжо не першы год у эфіры і магла б выходзіць далей — у звычным фармаце. Аднак стваральнікі вырашылі ўдасканаліць яго (над чым цяпер і працуюць)...**

**А пакуль усе, хто цікавіцца мовай, шануюць яе і, магчыма, плануюць удзел у віктарыне, могуць удасканальваць сваё веданне з дапамогай «Звязды». Рубрыка «Размаўляем па-беларуску» на звычным месцы, па пятніцах.**

**Ці ведалі вы, што:**

**абша́рнік** — памешчык;

**вінда** — прыстасаванне для пад'ёму грузаў;

**вы́цяцца** — ударыцца, стукнуцца;

**душнік** — адтуліна, дзірка для доступу паветра;

**зіхо́ткі** — які бліщчыць, ззяе пералівістым святлом;

**нэ́ндза** — 1) галеча, беднасць, 2) той, хто ўвесь час ные;

**нядо́шлы** — слабы, кволы;

**склюдава́ць** — секучы ўдоўж, здымаць паверхневы слой *(з дрэва і пад.)*;

**сцяць** — зняць, аддзяліць чым-небудзь вострым, ссячы, зрэзаць;

**тро́нкавы** (у выразе: тронкавы рухавік) — рухавік унутранага згарання тро́нкі — ручка нажа, відэльца;

**на ўсе за́стаўкі** — на ўсю моц, з усёй сілы (*беларускія сінонімы:* як ёсць духу, што моцы, колькі змогі; *рускія адпаведнікі:* напропалую, во всю ивановскую);

**ілбом сцяну не праб'еш** — пра марныя намаганні дасягнуць чаго-небудзь (*беларусы яшчэ скажуць:* хоць лоб і медны, але ж мур каменны; *рускія:* головой стены не прошибешь).

## Беларусь 1

**6.00** Слова Мітрапаліта Паўла на Хрышчэнне Гасподняе.
**6.10** Існасць.
**6.35 Меладрама «Прашу паверыць мне на слова» (16+).**
**8.25** Кулінарная дыпламатыя (12+).
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Маршрут пабудаваны. Іўе (12+).
**9.50** Здароўе (12+).
**10.40** Гісторыі выратавання.
**11.20** Зона Х. Вынікі тыдня (16+).
**12.10** «50 рэцэптаў першага» (12+).
**12.40 Серыял «Сваты-3» (12+).**
**13.35** «Я ведаю».
**15.15** Краіна.
**15.45 Меладрама «Мадэль шчаслівага жыцця» (12+).**
**17.35 Меладрама «Свой чужы сын» (16+).**
**21.00** Панарама.
**21.45 Меладрама «Вернешся — пагаворым» (12+).**
**0.55** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**7.00** М/с «Джынглікі» (0+).
**7.25** М/с «Кунг-фу панда: захапляльныя легенды» (12+).
**8.40, 21.55** Тэлебарометр.
**8.45** Анімацыйны фільм «Горад герояў» (0+).
**10.20, 0.30** Хто я? (12+).
**10.45** Капейка ў капейку (12+).
**11.20** Камень, нажніцы, папера (16+).
**11.55** «Паненка-сялянка» (16+).
**12.50** «Да пабачэння» (16+).
**13.40** «Вясельны памер» (16+).
**14.35 Камедыя «Дзіўнае жыццё Цімацi Грына» (12+).**
**16.25** «Тата трапіў» (16+).
**18.10 Камедыя «Рэд-2» (12+).**
**20.00 Меладрама «Ціхая гавань» (12+).**
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**22.05 Фантастыка «Трансформеры: помста паўшых» (12+).**

## Беларусь 3

**7.35** «Сіла веры».
**8.00, 15.05, 20.15** Навіны культуры.
**8.20, 15.20, 20.30** Гэты дзень.
**8.25** М/ф (0+).
**8.40 «Шмат шуму з нічога». Камедыя (12+).**
**10.00** «Жывая культура». Традыцыйнае белаўзорыстае ткацтва Панямоння (г. Ліда і вёскі раёна, Гродзенская вобласць).
**10.30** «Беларуская кухня». Кашанка.
**11.00** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+).
**11.25** «Спявае Беларусь».
**12.15 «Дзяржаўная граніца». Маст. фільм «Мірнае лета 21-га года» (12+).**
**14.35** «Навукаманія» (6+).
**15.25 «Чорны прынц». Маст. фільм (12+).**
**17.00** «Людзі сустракаюцца». Канцэрт паэта-песенніка Алега Жукава.
**18.30 «Белыя росы». Камедыя (12+).**
**20.00** «Суразмоўцы».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05 «Будзьце маім мужам». Меладрама (12+).**
**22.25** «Майстры і куміры». Народная артыстка Беларусі Таццяна Мархель.
**23.20** «Адвечная песня». Фольк-опера Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі паводле адназменнай паэмы Янкі Купалы.

## Беларусь 5

**6.55** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Юнацтва-Мінск» — ХК «Гомель».
**8.45** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Шахцёр» (Салігорск) — «Металург» (Жлобін).
**10.40** Біятлон. Этап Кубка свету. Рупольдынг. Эстафета. Мужчыны.
**12.05** Вялікі спорт.
**12.50** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Дынама» (Маладзечна) — «Нёман» (Гродна).
**15.15** Хакей для ўсіх.
**15.45** Легенды сусветнага спорту.
**16.20, 23.55** Біятлон. Этап Кубка свету. Рупольдынг. Эстафета. Жанчыны.
**17.50** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Ліверпуль» — «Крыстал Пэлас». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**19.50** Жанчыны і спорт. Кацярына Галкіна.
**20.20** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Арсенал» — «Чэлсі». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**22.20** Плаванне. Адкрыты чэмпіянат Беларусі.

## АНТ

**7.00, 9.00, 16.00** (з субцітрамі) Нашы навіны.
**7.10** «Іграй, гармонік любімы!» (6+).
**8.00** «Вольга Аросева. Рэцэпт яе шчасця» (12+).
**9.10** М/ф «Маша і Мядзведзь» (0+).
**9.35** «Ералаш» (6+).
**9.50 Маст. фільм «Афіцэры» (6+).**
**11.35** Да юбілею Васіля Ланавога. «Іншага такога няма!» (12+).
**12.35 Серыял «Зязюля» (16+).**
**16.20** Да 20-годдзя органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь. «Героі кожнага дня» (12+).
**16.55** Канцэрт, прысвечаны фільму «Афіцэры», у Дзяржаўным Крамлёўскім палацы (12+).
**18.50, 21.10** «Сёння ўвечары» (16+).
**20.00** «Нашы навіны». Суботні выпуск.
**20.45** «Метэагід».
**21.05** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**23.00 Трылер «Адступнікі» (16+).**

## СТБ

**6.15** «Ежа багоў» (16+).
**7.55** «Анфас».
**8.15** «Самая карысная праграма» (16+).
**9.10** «Мінтранс» (16+).
**10.00** «Мінск і мінчане».
**10.35** «Вялікі горад».
**11.10, 13.45, 16.45, 20.10 «Лепш не бывае». Серыял (16+).**
**13.30, 16.30, 19.30** Навіны «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**23.45** Дакументальны спецпраект (16+).
**0.50 «Метад». Серыял (18+).**

## МІР

**6.00, 8.05** М/ф (0+).
**6.15** «Мільён пытанняў аб прыродзе» (6+).
**6.30** «Саюзнікі» (12+).
**7.05** «Такія розныя» (16+).
**7.35** «Сакрэтныя матэрыялы» (16+).
**8.55** «Вой, мамачкі!» (12+).
**9.25** «Наша кіно. Гісторыя вялікага кахання» (12+).
**10.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Як у рэстаране» (12+).
**10.45 Маст. фільм «Жорсткі раманс» (12+).**
**13.50, 16.15, 19.15 Серыял «Кураж» (16+).**
**2.55 Серыял «Знак праўдзівага шляху» (16+).**

## РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Беларусі».
**10.00** «Сто да аднаго».
**11.00** Весткі.
**11.20** Пяцёра на аднаго.
**12.05 Маст. фільм «Пятроўка, 38» (12+).**
**13.35 Маст. фільм «Цана здрады» (12+).**
**15.15** «Далёкія блізкія» (12+).
**16.40 Маст. фільм «Так робіць жанчына» (12+).**
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.45** «Прывітанне, Андрэй!» (16+).
**22.45 Маст. фільм «Вясёлка жыцця» (12+).**

## НТБ—Беларусь

**6.05** «Астрапрагноз».
**6.10** Terra incognita. Беларусь невядомая (6+).
**6.40** «Зразумець і абясшкодзіць» (12+).
**7.10 Серыял «Агент асобага прызначэння» (16+).**
**8.00, 10.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.20** «НЗ.by».
**8.55** «Урачэбныя тайны плюс» (12+).
**9.25** «Гісторыі рамонту» (0+).
**10.25** Галоўная дарога (16+).
**11.05** «Ежа жывая і мёртвая» (12+).
**12.00** Кватэрнае пытанне (0+).
**12.55** «НашСпажыўНагляд» (16+).
**13.50** «Паедзем, паядзім!» (0+).
**14.20 Серыял «Урач» (16+).**
**16.25** «Следства вялі...» (16+).
**17.20 Маст. фільм «Супраць усіх правілаў» (16+).**
**19.25 Маст. фільм «Ратуйся, брат!»**
**22.35 Маст. фільм «Ніадкуль з каханнем, або Вясёлае пахаванне» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 19.00, 21.15, 1.10** «Надвор'е».
**7.05** М/ф «Баранчык Шон».
**7.15** Дак. серыял «Малышы».
**8.00** М/ф «Прынцэса і жаба».
**9.25** «Утрамдзія».
**9.30** Мастацтва-кіно. Меладрама «Знесеныя ветрам» (12+).
**13.20 Меладрама «Нявеста і забабоны» (12+).**
**15.10** «Адказвайка».
**15.15** «Глядзім усёй сям'ёй». М/ф «Птушыны спецназ».
**16.30 Трагікамедыя «Кін-дза-дза» (0+).**
**18.45** «Сябры дзядулі Марка».
**19.05 Дэтэктыў «Лёс лорда Эджвара».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Фэшн is my прафэшн».
**21.20 Трылер «Бой з ценем» (16+).**
**23.25 Трагікамедыя «Пашпарт» (16+).**





## ВТБ

**6.05** Серыял «Татавы дочкі» (12+).
**7.25** М/ф «ЧычыЛэнд» (0+).
**7.45** М/ф «Ліга Watch-car» (6+).
**8.15** М/ф «Машыны казкі» (0+).
**8.40, 3.45** «Ералаш» (6+).
**9.25, 17.15** «Уральскія пельмені». (16+).
**10.20, 18.45** Серыял «Шчаслівыя разам» (16+).
**11.40, 23.55** Серыял «Дзённік доктара Зайцавай» (16+).
**12.40, 20.00** Серыял «Маладзёжка» (16+).
**13.40, 3.00** «Рублёва-Бірулёва» (16+).
**14.40, 2.10** Скетч-шоу «Адна за ўсіх» (16+).
**15.30** Мюзікл «Танцы вуліц». (12+).
**21.00** Серыял «Атэль «Элеон»-3» (16+).
**22.00** Камедыя «Сужэнцы Морган ва ўцёках». (12+).



**0.55** Серыял «Бязмоўны сведка». (16+).
**4.00** «Лаві момант» (16+).
**5.00** «Дурні і дарогі» (16+).

## Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.45** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...» Масква кіношная.
**7.05, 20.05** «Правілы жыцця».
**7.35** «Сіта і Рама». Серыял.
**8.20, 22.55** «Эйнштэйн». Серыял (16+).
**10.15** «Назіральнік».
**11.10** ХХ стагоддзе. «Мядзведжы цырк», «Наваселле Алега Папова». Дак. фільмы.
**12.05, 16.25** Сусветныя скарбы.
**12.25, 18.45, 0.45** «Тым часам. Сэнсы».
**13.15, 0.05** «Памылка фартуны». Дак. фільм.
**14.00, 20.45** «Цывілізацыі». Дак. серыял.
**15.10** «Пятае вымярэнне».
**15.40** «Белая студыя».
**16.40** «Чалавек у прахадным двары». Маст. фільм. 1-я серыя (12+).
**17.50** Камерная музыка. Квартэт імя Давіда Ойстраха.
**19.45** Галоўная роля.
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**21.45** Штучны адбор.
**22.25** «Тыя, з якімі я...» Георгій Рэрберг». Частка 2-я.
**1.30** Раман у камені. «Іспанія. Тартаса». Дак. фільм.
**2.00** — *Прафілактыка.*

## Настальгія

**6.00** «Гэты фантастычны свет». 1982 год (12+).
**7.25, 13.00, 15.45, 17.00, 19.00, 20.25, 21.45, 23.00, 2.20, 5.20** Музычная настальгія (12+).
**7.40** «Зямля — Паветра». Дэцл. 2003 год (16+).
**9.00** Тэлеспектакль «Дом, дзе разбіваюцца сэрцы». 1975 год (12+).
**12.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Рускі рок. Аляксандр Башлачоў». 2005 год (18+).
**13.15, 19.20** Маст. фільм «Актыўная зона» (16+).
**14.25** «Ранішняя пошта». «Масква». 1989 год (12+).
**15.00, 21.00** «Мінулы час» (12+).
**16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**18.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Кааператары. Яны былі першымі». 2007 год (16+).
**0.00** Канцэрт «Машина времени» і гурт «Цветы» (12+).
**1.10** «Аншлаг? Аншлаг!» 1989 год (12+).
**3.00** «Быў час». 2009 год (16+).
**4.00** Праграма «Погляд». 1988 год (16+).

## EuroSport 1

**1.30** Ралі-рэйд. «Дакар».
**2.00, 3.00, 7.00, 11.15, 19.00** Тэніс. Australian Open.
**2.30, 16.15** Тэніс. «Гейм, Шэт і Матс».
**11.00** Тэніс. «Гейм, Шэт і Матс»-экстра.
**16.45** Горныя лыжы. Кубак свету.
**18.00** Конны спорт. Кубак свету.
**19.00** Валейбол. «Тайм-аўт».
**20.00** Аўтагонкі. Формула Е.
**21.00** Снукер. «Мастэрс».

## Кінакамедыя

**0.45** Елкі лахматыя (6+).
**2.20** Святочны перапалох (16+).
**4.30** Шалёныя суседзі (16+).
**6.15** Дзевяць ярдаў (18+).
**8.10** Крутая Джорджыя (16+).
**10.20** Дзённік кар'ерысткі (16+).
**12.05** Вельмі дрэнная настаўніца (18+).
**13.55** Анёлы Чарлі (12+).
**15.50** Анёлы Чарлі-2: толькі наперад (12+).
**17.45** Ажаніся са мною, чувак (18+).
**19.30** Правілы здыму: метад Хітча (12+).
**21.45** Я выйшла замуж за прыдурка (16+).
**23.55** Маленькая чорная кніжка (16+).

## ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**7.10** «Школа доктара Камароўскага» (6+).
**7.55** «Доктар I...» (16+).
**8.30, 19.00, 2.30** «Асколкі». Серыял (16+).
**9.40, 23.20** «Улегцы» (12+).
**10.10, 3.40** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**11.55, 17.40** «Варажбітка» (12+).
**13.10, 16.45, 5.10** «Містычныя гісторыі» (12+).
**14.10** «Адкрыта» з Аксанай Байрак» (16+).
**15.10** «Простыя складанасці» (12+).
**15.45** «Натуральны адбор» (12+).
**20.30** «Смяротны трэнінг». Серыял (12+).
**21.30** «Нераскрытыя тайны» (12+).
**22.30** «Вяселле і развод» (16+).
**23.50** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
**0.35** «Вечнае ззянне чыстага розуму». Драма (16+).

## ТБ1000

**6.10, 17.30** Эрын Брокавіч — прыгожая і рашучая (16+).
**8.45** Сфера (16+).
**11.05** Вечнасць (16+).
**13.30** Рок Дог (6+).
**15.30** Маё вялікае грэчаскае вяселле-2 (16+).



**20.10** Стальныя магноліі (0+).
**22.25** 13-ы раён (16+).
**0.00** Браты Блюз 2000 (12+).
**2.15** Капітан Фантастык (18 +).
**4.15** Прысяжная (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** На краі стаю (16+).
**8.10** Мне не баліць (16+).
**10.15** Гітлер капут! (16+).
**12.15** Вій (12+).
**14.45** Памятаю — не памятаю! (12+).
**16.20, 4.20** Усё да лепшага-2. Серыя 1—2 (12+).
**18.15** Першы пасля бога (16+).
**20.20** Першыя (12+).
**22.20** Маргарыта Назарава (16+).
**0.20** Ваўкалакі (16+).
**2.10** Кухня ў Парыжы (12+).

## National Geographic

**6.00** Самыя дзіўныя фатаграфіі National Geographic (16+).
**6.20** Дзікая прырода Расіі (16+).
**8.00** Аўта-SOS (12+).
**9.30** Адкруць бяруцца дыктатары (16+).
**10.15** Надзвычайны доктар Пол (16+).
**11.05** Настольная кніга дыктатара (16+).
**11.50** Ледзяная дарога (16+).
**12.35, 19.40** Востраў бунтароў (16+).
**13.20, 20.25** Сіла племені (16+).
**14.10** Дзікі тунец (16+).
**15.40, 1.55** Гарачыя граніцы (16+).
**16.25, 21.10, 2.45** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**17.15, 22.00, 1.10, 4.25** Інстынкт выжывання (16+).
**22.45** Забіць Рэйгана (16+).
**0.25** Гісторыя пра нас (16+).
**5.10** Найбуйнейшы ў свеце рамонт (16+).

## Discovery

**8.00, 14.00, 16.00, 22.00, 3.50** Махінатары (12+).
**9.00, 17.00, 23.00, 4.40** З любасці да машын (12+).
**10.00, 15.00, 21.00** Як гэта зроблена? (12+).
**11.00, 20.00, 5.30** Багажныя войны (12+).
**12.00, 18.00, 1.00, 6.20** Гіганцкія мячы (12+).
**13.00** Мадэль для зборкі (12+).
**19.00** Рэальныя дальнабойшчыкі (12+).
**0.00** Голыя і напалоханыя (16+).
**2.00, 7.10** Скрозь кратовую нару (12+).
**2.55** Музейныя тайны (12+).

## серада, 16 студзеня



### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.15** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 023.55** «Зона Х» (16+).
**9.10, 22.05 Серыял «След» (16+).**
**10.50, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Усход-Захад» (16+).**
**13.05** Дзіцячы доктар.
**13.35** Дзень у вялікім горадзе.
**14.30, 15.25 Серыял «Пакаёўка» (16+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**21.00** Панарама.
**21.50** «На кантролі Прэзідэнта».
**23.35** Сфера інтарэсаў.
**0.30** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** «Уключайся!» (12+).
**9.00, 17.25** Тэлебарометр.
**9.05, 20.10 Серыял «Сляпая» (16+).**
**10.05, 22.40** «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
**11.00, 17.30 Серыял «Маскоўская барзая» (16+).**
**12.50, 23.40 Серыял «Самара» (16+).**
**13.45, 19.15** «Арол і рэшка. Кругасветка» (16+).
**14.45** «Паненка-сялянка» (16+).
**15.40** Нічога сабе ньюз (12+).
**15.45, 0.25** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект (12+).
**16.25** «Вясельны памер» (16+).
**21.05, 22.05** «Абмен жонкамі» (16+).
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНО.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабрананак».
**7.35, 15.00** «Беларуская кухня». Юшка з крыві.
**8.05, 12.00, 20.15** Навіны культуры.
**8.20, 12.20, 20.30** Гэты дзень.
**8.25, 18.30 Маст. фільм «Гэтыя вочы насупраць» (16+).**
**9.20, 17.35 Маст. фільм «Каралева Марго» (16+).**
**10.15** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+).
**10.40** «Беларусь як песня». Тамара Пячынская.
**11.05** «Майстры і куміры». Народны артыст Беларусі Леанід Захлеўны і ансамбль народнай музыкі «Бяседа».
**12.25, 19.20** «Выдатныя авіяканструктары». Георгій Бярыеў (12+).
**13.00, 21.45 Маст. фільм «Выклікаем агонь на сябе» (12+).**
**14.20, 21.05** «Апошні дзень». Юрый Гуляеў (12+).
**15.30** «Артэфакты». Рыцарскія даспехі з Мсціслава.
**15.55** Юбілейны канцэрт ансамбля народнай музыкі «Бяседа».
**20.00** «Архітэктура Беларусі».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.55** «Запіскі на палях». Пімен Панчанка: сінія касачы для паэта-філосафа.
**23.25** «І песня ўзлятае сама...» Песенная творчасць кампазітара Уладзіміра Алоўнікава.

### Беларусь 5

**7.10** Хакей. Ліга чэмпіёнаў. 1/2 фіналу. Матч у адказ. «Пльзень» (Чэхія) — «Фрэлунда» (Швецыя).
**9.00** Спорт-кадр.
**9.30** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Віцязь» (Маскоўская вобл.).
**11.35** Матч-пойнт.
**12.05** Біятлон. Этап Кубка свету. Аберхоф. Гонка праследу. Жанчыны.
**13.00** Біятлон. Этап Кубка свету. Аберхоф. Гонка праследу. Мужчыны.
**13.55** Хакей. КХЛ. «Барыс» (Астана) — «Спартак» (Масква).
**15.50** Агнявы рубеж.
**16.20** Біятлон. Этап Кубка свету. Рупольдынг. Спрынт. Мужчыны.
**17.40** Слэм-данк.
**18.10** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Юнацтва-Мінск» — «Металург» (Жлобін). (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**20.20** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Шахцёр» (Салігорск) — ХК «Гомель». (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**22.30** Хакей. Ліга чэмпіёнаў. 1/2 фіналу. Матч у адказ. ХК «Зальцбург» (Аўстрыя) — ХК «Мюнхен» (Германія). (У перапынках — Спорт-цэнтр.)

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.10, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**9.10** «Жыць здорава!» (16+).
**10.20, 11.10 Серыял «Дэтэктывы» (16+).**
**11.50** «Модны прыгавор» (12+).
**13.10 Серыял «Падары мне нядзелю» (16+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+).
**16.20** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.25, 18.20** «На самай справе» (16+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**19.00** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.10 Серыял «Султан майго сэрца» (16+).**
**23.00** «Рэпарцёр» (16+).
**23.20 Серыял «Сакратарка» (16+).**
**1.15** «Нашы навіны». Галоўнае за дзень.

### СТБ

**5.30** «Тыдзень спорту».
**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**6.10, 20.15** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**9.10** «Мінск і мінчане».
**9.40, 23.05** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**10.40, 20.30 Серыял «Баец» (16+).**
**12.10** «Вадзіць па-руску» (16+).
**12.40, 23.50** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**13.45** «Ежа багоў» (16+).
**15.20, 16.50 Серыял «Лепш не бывае» (16+).**
**19.55, 23.00** «СТБ-спорт».
**20.05** «Сталічныя падрабязнасці».
**22.00** «Глядзець усім!» (16+).

### МІР

**6.00** «Вой, мамачкі!» (12+).
**6.30, 10.10 Серыял «АСА» (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15, 2.50** «Зала суда. Бітва за грошы» (16+).
**14.10, 1.00** «Справы сямейныя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05, 1.55** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15, 0.10** «Гульня ў кіно» (12+).
**17.00 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**19.20, 3.40 Серыял «Сужэнцы» (16+).**
**21.20 Маст. фільм «Дакрануцца да неба» (16+).**
**23.30** Дак. фільм «Бітва за волю» (12+).
**5.30** «Наша кіно. Гісторыя вялікага кахання» (12+).

### РТР—Беларусь

**7.00 Маст. фільм «Салодкае развітанне Веры» (12+).**
**9.00 Маст. фільм «Украсці Бельмандо» (12+).**
**11.00, 14.00, 20.00** Весткі.
**11.25** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
**12.35, 14.30, 0.25 Серыял «Тайны спадарыні Кірсанавай» (12+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**15.35** «60 хвілін». Ток-шоу.
**17.00** Весткі. Мясцовы час.
**17.25** «Лёс чалавека» (12+).
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**20.40, 23.10 Серыял «Кругаварот» (12+).**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10** Белавежская пушча (6+).
**6.25** Беларусы (6+).
**7.10** «НашСпажыўНагляд» (16+).
**8.05 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).**
**9.40, 23.15** «НЗ.by».
**10.20 Серыял «Злачынства будзе раскрыта» (16+).**
**12.10** Пракурорская праверка (16+).
**13.25, 18.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**13.55 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч. Лёсы» (16+).**
**15.30, 16.30 Серыял «Наша шчаслівае заўтра» (16+).**
**17.45 Серыял «Неўскі» (16+).**
**19.45 Серыял «Павуцінне» (16+).**
**23.40 Серыял «Паверх» (18+).**

### 8 канал

**7.00, 15.55, 19.20, 21.05, 0.15** «Надвор'е».
**7.05** М/с.
**7.25, 16.00** «Гумарынка»
**7.30 Серыял «Дальнабойшчыкі» (16+).**
**8.20, 17.00 Серыял «Пражыць жыццё» (16+).**
**10.00** «Малюючы Кітай» (0+).
**10.30, 18.35 Серыял «Касл» (12+).**
**11.15, 19.25 Серыял «Палацавыя тайны» (12+).**
**12.35 Камедыя «Тытунёвы капітан» (12+).**
**14.00 Серыял «Безразважна закаханыя» (12+).**
**16.05** «Мультпарад» (0+).
**20.50** «Вечарніца».
**21.10 Камедыя «Мііно» (12+).**
**22.45 Камедыя «Чыста адэская гісторыя» (12+).**

## пятніца, 18 студзеня



### ВТБ

**6.05** Серыял «Татавы дочкі» (12+).
**7.25** М/ф «ЧычыЛэнд» (0+).
**7.45** М/ф «Ліга Watchcar» (6+).
**8.15** М/ф «Машыны казкі» (0+).
**8.40, 3.45** «Ералаш» (6+).
**9.25, 17.40** «Уральскія пельмені». (16+).
**10.20, 18.45** Серыял «Шчаслівыя разам» (16+).
**11.40** Серыял «Дзённік доктара Зайцавай» (16+).
**12.40** Серыял «Маладзёжка» (16+).
Наогул, дадзены інструмент дазволіць невідушчым слухаць трансляцыю тэлевізійных каналаў і радыёстанцый, аўдыякніжкі і навіны з мясцовых газет, інфармацыю з інтэрнэту і з флэшак, нават весці перапіску. Першая партыя мультымедыйных плэераў ужо перададзена людзям з інваліднасцю па зроку не толькі ў Мінску, але і ў іншых рэгіёнах краіны. Яны прайшлі неабходную падрыхтоўку і цяпер самі будуць выступаць у якасці трэнераў — навучаць карыстацца плэерам.

**Святлана БУСЬКО.**

# ПАВЕРЫЦЬ У МАРУ

## Ад біягумусу да крафтавага піва — чым займаюцца сельскія бізнесмены?

**Вытворчасць драўляных вокнаў, біягумусу, крафтавага піва, сумак з ручной вышыўкай, майстэрня па рамонце адзення, свая станцыя тэхнічнага абслугоўвання аўто і ферма па вырошчванні трусоў — 24 прадпрымальнікі паверылі ў сваю мару і атрымалі сродкі на ўласны бізнес.**



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### Старт — ап!

Чароўнымі «феямі», якія далі магчымасць рэалізаваць ідэі, сталі грамадскія арганізацыі «Экапартнёрства» і «Жанчыны за адраджэнне Нарачанскага краю». Пры падтрымцы Еўрапейскага саюза яны арганізавалі бізнес-інкубатар і Школу сельскага бізнесу.

Ідэю, што бізнес і вёска — паняцці сумяшчальныя, падтрымалі як мінімум 140 чалавек. Столькі прэтэндэнтаў жадалі заняць месца за «школьнай» партай у вёсцы Камарова. Але для чатырох вучэбных сесій былі адабраны толькі 43 слухачы. Пчаляры, будаўнікі, леснікі, педагогі, былыя прадпрымальнікі і беспрацоўныя... Прапанаваць сваю ідэю для стартапу і стаць навучэнцам меў магчымасць амаль кожны сельскі жыхар. Адно абмежаванне — кандыдаты павінны жыць у Мядзельскім, Смаргонскім, Пастаўскім ці Астравецкім раёне.

«Гэтыя раёны з'яўляюцца ўнікальнай сельскай тэрыторыяй, што знаходзіцца побач з мяжой Еўрапейскага саюза, — растлумачылі выбар рэгіёнаў у прэс-службе «Экапартнёрства». — Яны аддаленыя ад буйных прамысловых цэнтраў, таму менавіта развіццё малога і сярэдняга прыватнага бізнесу можа стаць крыніцай стварэння новых рабочых месцаў».

Настаўнікамі школы сталі вопытныя беларускія і замежныя эксперты, кожны з якіх выкладаў блок па сваёй спецыяльнасці. Сярод іх — трэнеры-кансультанты па маркетынгу, кіраванні, планаванні праектаў і зборы сродкаў, спецыялісты па рэгіянальным развіцці, юрысты.

Асноваа практычных заняткаў — праца над уласным праектам. У канцы навучання ўдзельнікі прадставілі журы бізнес-планы і спаборнічалі за фінансавую падтрымку. Грант на развіццё стартапу ў памеры ад 2 да 10 тысяч еўра атрымалі 24 прадпрымальнікі.

«Першапачаткова планавалася завяршыць праект у студзені 2019 года, але рэалізацыя ініцыятыў мясцовых прадпрымальнікаў патрабуе больш часу, — расказалі ў «Экапартнёрстве». — Многія з іх зараз толькі на этапе закупкі тэхнікі і рамонту памяшканняў, таму праект працягнем да лютага 2020 года».

### Дзяржава — бізнесу

Паколькі капітал, рабочая сіла і дзелавая актыўнасць больш ахвотна канцэнтруюцца ў буйных гарадах, для стымулявання прадпрымальніцкай ініцыятывы ў сельскай мясцовасці дзяржава выкарыстоўвае шэраг інструментаў.

Адным з іх стаў Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 6 «Аб стымуляванні прадпрымальніцкай дзейнасці на тэрыторыі сярэдніх, малых гарадскіх паселішчаў, сельскай мясцовасці», прыняты ў 2012 годзе.

«Ільготы, замацаваныя Дэкрэтам № 6, можна ўмоўна падзяліць на тры групы: ільготы, звязаныя з выплатай падаткаў, збораў (пошлін); прэферэнцыі, звязаныя з выкарыстаннем дзяржаўнай маёмасці; іншыя льготы і прэферэнцыі, сярод якіх спрошчаныя спосабы набыцця сыравіны і камплектуючых, асаблівыя ўмовы рэалізацыі сваёй прадукцыі і іншае, — паведамілі ў Міністэрстве эканомікі. — Прычым падатковыя прэферэнцыі па згаданым дэкрэце дзейнічаюць не ўвесь час, а толькі першыя сем гадоў: гэта дастатковы тэрмін для напрацоўкі гаспадарчых сувязяў, рынкаў збыту, пачатку ўстойлівай працы ў роўных умовах».

Сёння можна гаварыць аб тым, што закон адыграў сваю станоўчую ролю ў развіцці прадпрымальніцтва ў малых і сярэдніх гарадах і сельскай мясцовасці — колькасць суб'ектаў гаспадарання за пяць гадоў узрасла больш чым на чвэрць (27,2 %).

Пры жаданні арганізаваць бізнес у першую чаргу трэба вызначыць, чаго не хапае ў рэгіёне. Найбольш запатрабаваны, як паказвае практыка, з'яўляецца сфера паслуг і гандаль. Працэс адкрыцця ўласнага прадпрыемства значна аблегчыў Дэкрэт «Аб развіцці прадпрымальніцтва», які дзейнічае з канца 2017 года.

«Перш за ўсё, ім прадугледжаны паведамляльны парадак пачатку вядзення бізнесу, — растлумачылі ў Мінэканомікі. — Ён прасцейшы, хутчэйшы, спалучаны з меншымі выдаткамі, выключае дадатковыя дзеянні: уключэнне ў рэестры, рэгістры, базы даных і іншае».

Дакументам ліквідаваны многія адміністрацыйныя бар'еры ў сферы будаўніцтва, гандлю, грамадскага харчавання, бытавога абслугоўвання, рэкламы, міжнародных перавозак. Вызначаны мінімальны дастатковы пералік абавязковых супрацьпажарных, санітарна-эпідэміялагічных, ветэрынарных, прыродаахоўных і іншых патрабаванняў. Іх колькасць скарацілася прыкладна ў 10 разоў.

Шэраг нарматыўных актаў з «лібералізацыйнага пакета» накіраваны на актывізацыю самазанятасці.

Для працягу работы па стварэнні спрыяльных умоў для бізнесу ўрадам зацверджана стратэгія «Беларусь — краіна паспяховага прадпрымальніцтва» на перыяд да 2030 года. Гэта аснова для каардынацыі дзеянняў органаў улады, бізнес-супольнасці, суб'ектаў інфраструктуры падтрымкі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва пры прыняцці рашэнняў па стварэнні камфортных умоў вядзення бізнесу.

У цяперашні час Міністэрства эканомікі сумесна з зацікаўленымі бакамі займаюцца дарожнай картай стратэгіі на перыяд да 2020 года. У ёй адным з прыярытэтаў развіцця пазначаныя рэгіёны.

**Марыя ДАДАЛКА.**

РЫНАК ПРАЦЫ

# БУХГАЛТАР У ЦАНЕ

## Колькі можна зарабіць у Баранавічах і раёне?

**Паводле інфармацыі дзяржаўнай службы занятасці, баранавіцкая аб'яднаная газета «Наш край» прааналізавала вакансіі, якія існуюць у рэгіёне.**

Усяго тут патрабуюцца 1762 работнікі розных галін. У агульнарэспубліканскім банку размешчана 1109 вакансій па горадзе і 653 па раёне.

З павелічэннем 1 студзеня мінімальнага заробку ўзровень самых нізкааплатных прафесій на поўную стаўку ўзрос з 305 да 330 рублёў.

Адна з самых апошніх вакансій з заробкам у 330 рублёў у раёне з'явілася 4 студзеня. Аператар жывёлагадоўчых комплексаў і механізаваных ферм з агульнай сярэдняй адукацыяй патрабуецца на Баранавіцкі камбінат хлебапрадуктаў у вёсцы Цяплівады. З такой жа сціплай аплатай працы шукаюць інжынера-праграміста з вышэйшай адукацыяй у Брэсцкае абласное кадэцкае вучылішча ў вёсцы Ястрамбель.

З заробкам у 330—350 рублёў размешчана 40 вакансій у Баранавіцкім раёне.

Ад 1000 рублёў — 7 аб'яў. Самая «гарачая» ад 27 снежня 2018 года. Начальнік, які патрабуецца ў Баранавіцкае райпо (аг. Мір), павінен мець вышэйшую адукацыю. Кіроўцу аўтамабіля ААТ «Волахва-транс» з такім жа заробкам не могуць знайсці з 27 снежня 2017 года.

Што датычыцца вакансій па горадзе, то зарплату ад 1000 рублёў абяцаюць 23 саіскальнікам, сярод якіх большая частка — швачкі.

Наймальнік ЗАТ «Беллестэхмантаж» гатовы заплаціць галоўнаму бухгалтару 3000 рублёў. Патрабаванняў да кандыдата няшмат: вышэйшая адукацыя, працоўны досвед ад 8 гадоў, дадатковы вопыт у аўдытарскай кампаніі з міжнароднай акрэдытацыяй ад 3 гадоў і многія іншыя. Астатнія высокааплатныя вакансіі па горадзе размешчаны на сайце значна раней, у лістападзе і кастрычніку 2018 года.


**ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион**

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690-54-09, **WWW.BELTORGI.BY**

Продавец: ОАО «Строительно монтажный трест № 40» (УНП 400076022) в лице управляющего Дрика Александр Иванович, тел. +375 44 7500376.

Публичные торги в электронной форме в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены: **12 февраля 2019 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **WWW.BELTORGI.BY.**

Предмет торгов – комплекс зданий: здание склада с инв. № 320/С-32155, площадью 221,7 кв. м; гараж с инв. № 320/С-32313, площадью 202,2 кв. м; склад для ТМЦ с инв. № 320С-32577, площадью 35,5кв. м; здание цеха деревообработки с пристроенным кирпичным отапливаемым бытовым помещением с инв. № 320/С-14086, площадью 297,4 кв. м; здание склада с инв. № 320/С-20266, площадью 172,8 кв. м; здание склада с инв.№320/С-14085, площадью 175,5 кв. м; здание бытового помещения с инв.№320/С-20331, площадью 151,1 кв. м, водопровод стальной 245 м, расположенных на земельном участке с кадастровым № 340800000003000136,по адресу: ул. Шоссейная,151, г. Жлобин, Гомельская обл. Начальная цена – 144 722,16 бел. руб. с НДС, шаг торгов и задаток – 7 236,11 бел. руб. с НДС.

Контактный телефон для ознакомления и осмотра +375 29 622-29-90, Семченко Алексей Иванович.

**Для участия в торгах необходимо в срок по 11 февраля 2019 г. 17.00** 1) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY06-SOMA30120013860101000933 в ЗАО «Идея Банк», код SOMABY22, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация», 2) подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **WWW.BELTORGI.BY**, 3) направить в отсканированном виде все прилагаемые к заявке документы по адресу: marketing@zalog.by (подробнее – в информации лота на сайте **WWW.BELTORGI.BY**).

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет электронных торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Оформление результатов торгов в день их проведения.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а также аукционный сбор. После этого между продавцом и победителем электронных торгов в течение пяти дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи предмета торгов

**РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «КАМВОЛЬ»**

**Лот № 1, состав лота:** 1. Б 2/к. Здание красильного цеха, инв. № 500/С-48739. Площадь – 11754 кв. м. 1959 г. п. 2. Г 2/к Склад готовой продукции, инв. № 500/С-49630. Площадь – 589 кв. м. 1961 г. п. 3. Е 4/к Склад готовой продукции, инв. № 500/С-49632. Площадь – 1794 кв. м. 1971 г. п. 4. М1/к Здание склада ГСМ, инв. № 500/С-49634. Площадь – 314 кв. м. 1960 г. п. 5. Пристройка к административному строению, инв. № 500/С-49635. Площадь – 1669 кв. м. 1983 г. п. 6. Т 2/к Ртутный цех, инв. № 500/С-49636. Площадь – 231 кв. м. 1974 г. п. 7. Здание специализированное иного назначения (насосная), инв. № 500/С-50227. Площадь – 121,1 кв. м. 1970 г. п. 8. Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, инв. № 500/С-50228. Площадь – 129,9 кв. м. 1970 г. п. 9. Литер 1 Л1/К Здание склада, инв. № 500/С-50272. Площадь – 1017 кв. м. 1969 г. п. 10. Станция водохимподготовки, инв. № 500/С-50291. Площадь – 1524 кв. м. 1959 г. п. 11. Литер Н 3/К Здание котельной, инв. № 500/С-50292. Площадь – 2298 кв. м. 1961 г. п. 12. Литер Ы 1/к Здание ГРП, инв. № 500/С-50293. Площадь – 33 кв. м. 1961 г. п. 13. Литер О 1/к Мазутохранилище, инв. № 500/С-50320. Площадь – 76 кв. м. 1970 г. п. 14. Центральный материальный склад, инв. № 500/С-51953. Площадь – 1000,5 кв. м. 1975 г. п. 15. Авторемонтная мастерская, инв. № 500/С-53450. Площадь – 1141,4 кв. м. 1991 г. п. 16. Гаражи, пожарное депо, инв. № 500/С-53451. Площадь – 1136,2 кв. м. 1975 г. п. 17. Склад тары, инв. № 500/С-53452. Площадь – 80,5 кв. м. 1955 г. п. 18. Склад масел, инв. № 500/С-53453. Площадь – 14,3 кв. м. 1979 г. п. 19. Кабинеты, кладовая, коридоры, душевые, туалет, инв. № 500/С-53454. Площадь – 114 кв. м. 1992 г. п. 20. Открытый склад металла, инв. № 500/С-53499. Площадь – 458,6 кв. м. 1972 г. п. 21. Здание склада эфира, инв. № 500/С-53501. Площадь – 44,5 кв. м. 1973 г. п. 22. Подстанция, инв. № 500/С-64663. Площадь – 64 кв. м. 1968 г. п. Адрес: 23. Сторожевая будка, инв. № 500/С-64664. Площадь – 6 кв. м. 1970 г. п. 24. Сторожевая будка, инв. № 500/С-64665. Площадь – 4 кв. м. 1959 г. п.

**Адрес местоположения объектов:** г. Минск, ул. Маяковского, д. 176.

**Начальная цена – 13 580 520,00 бел. руб. с НДС.**
**Задаток – 135 805,20 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %**

**Обременения**: 1. В капитальных строениях с инвентарным номером 500/С-48739 (здание красильного цеха) и инвент торговарным номером 500/С-53451 (гаражи, пожарное депо) расположены защитные сооружения, находящиеся в государственной собственности, которые не являются предметом торгов. 2. Договор безвозмездного пользования имуществом от 01.09.2010 № 04-18/239 (гаражи, пожарное депо с инвентарным номером 500/С-53451) на срок по 30.09.2019

**Земельный участок:** земельный участок площадью 6,4449 га с кадастровым номером 500000000003005056. Право аренды: по 31.08.2056. Переход права осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

**Условия аукциона:** 1. Победитель аукциона либо в случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Лот № 1 по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов) – Претендент на покупку должен подписать с Продавцом договор купли-продажи в течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента определения Победителя аукциона (Претендент на покупку).
2. Условия оплаты приобретенного на аукционе Лота № 1 согласовываются с Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при подписании договора купли-продажи.
3. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 0,25 % от цены продажи Лота № 1 в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 13.02.2019 в 11.00 по адресу:**
**г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Продавец: ОАО «Камволь», 220028, г. Минск, ул. Маяковского, д. 176, тел. 8 (017) 223-14-18.
Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 4, тел. 8 (017) 324-70-57.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества (Лот № 1), принадлежащего ОАО «Камволь», проводимом 13.02.2019 г. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 11.02.2019 в 11.00. Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом. Контактное лицо для осмотра Объекта – Волчек Дмитрий, тел. 8 (029) 366-76-28

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

# ЯКАСЦЬ ЖЫЦЦЯ НАСЕЛЬНІЦТВА ЯК КРЫТЭРЫЙ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ ЎСТОЙЛІВАГА РАЗВІЦЦЯ РЭГІЁНАЎ

**З вялікай цікавасцю прачытаў артыкул Алега Сівагракава «Маніторынг і ацэнка мясцовых стратэгій устойлівага развіцця» («Звязда» за 28 снежня 2018 года). Увага газеты да праблем рэгіянальнага развіцця, на маю думку, дастаткова высокая. Я маю на ўвазе не толькі дадатак «МС», але і іншыя матэрыялы, якія знаёмяць чытачоў з жыццём насельніцтва тых ці іншых рэгіёнаў. Мне як чытачу газеты і эканоміка-географу хочацца таксама выказаць сваё бачанне далейшага рэгіянальнага развіцця краіны.**

Нельга не пагадзіцца са сцвярджэннем спадара Сівагракава, што «Рэгіянальная аналітыка часцей за ўсё адлюстроўвае стан спраў у галінах эканомікі, або, значна радзей, у раёнах». Аднак аўтар не нагадвае прычыну такой сітуацыі, а яна звязана з дзяржаўнай статыстыкай, якая нават на абласным узроўні адлюстроўвае паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця ў лепшым выпадку ў адміністрацыйных раёнах і гарадах абласнога падпарадкавання. Што датычыцца ўзроўню сельсаветаў, а тым больш асобных населеных пунктаў, ён застаецца прэрагатывай даследчыцкіх даследаванняў ці аматараў-краязнаўцаў. Між тым ва ўмовах рыначнай эканомікі пераважнае значэнне мае рэгіён, які стварае спрыяльныя ўмовы для функцыянавання суб'ектаў гаспадарання, а не галіна як аб'ект эканамічнага кіравання.

Распрацоўка і рэалізацыя мясцовых стратэгій устойлівага развіцця (СУР), якая вядзецца ўжо не адзін дзясятак гадоў, прынцыпова праблему паляпшэння якасці жыцця насельніцтва на лакальным узроўні і высокай яе рэгіянальнай дыферэнцыяцыі не вырашыла. Наадварот, гэта дыферэнцыяцыя ў сучасных умовах яшчэ больш паглыбляецца. Не мной заўважана, што кожная дзяржава, і Беларусь не выключэнне, павінна быць зацікаўлена ў паспяховым развіцці ўсіх сваіх частак, а не асобных рэгіёнаў. Пры трывалым замежным фінансаванні за 20 гадоў дзейнасці трэба было «разбудзіць» не 180 ініцыятыў, а ў дзясяткі разоў больш. Адных сельскіх Саветаў у краіне налічваецца звыш тысячы. Як бачна з артыкула Алега Сівагракава, апублікаваны СУР Беларусі 19 сельсаветаў. Мяркую, не толькі мне, але і іншым чытачам газеты, было б цікава пазнаёміцца з такімі распрацоўкамі і ўбачыць рэальныя іх поспехі. Вядома, што каштоўнасць любой тэарэтычнай схемы заключаецца ў магчымасцях яе рэалізацыі на практыцы. Вучонымі ўжо даўно даказана, што адрозненні ў сацыяльна-эканамічным развіцці рэгіёнаў у найбольшай ступені звязаны з іх эканоміка-геаграфічным становішчам, рознай структурай эканомікі, асаблівасцямі рассялення, забяспечанасцю рэгіёнаў працоўнымі і прыроднымі рэсурсамі, аб'ектамі сацыяльнай інфраструктуры і інш. Акрамя гэтых аб'ектыўных прычын, пэўную ролю адыгрываюць і суб'ектыўныя фактары, звязаныя з інстытуцыянальнымі пераўтварэннямі, якія ажыццяўляе ўрад на рэгіянальным узроўні: развіццё малога прадпрымальніцтва, бюджэтнае фінансаванне, палітыка падаткаабкладання і г. д. Нельга скідваць з рахунку і такія нематэрыяльныя фактары, як прывабнасць рэгіёна ці населенага пункта, творчы патэнцыял мясцовага насельніцтва. Менавіта на ўлік апошніх і робіцца асноўная стаўка пры распрацоўцы СУР на мясцовым узроўні. Аднак, нягледзячы на розны характар прычын рэгіянальнай дыферэнцыяцыі, галоўнай застаецца праблема яе змяншэння. Пры гэтым шляхі вырашэння праблемы таксама павінны быць дыферэнцыраванымі, гэта значыць для кожнага з рэгіянальных узроўняў патрабуецца свой «набор» мерапрыемстваў. Вось гэта, на маю думку, павінна быць галоўным пры распрацоўцы СУР. Акрамя фестываляў кветак, каменных скульптур, дэманстрацыі сувеніраў, што ўплываюць на турыстычны патэнцыял, але яны эканоміку не выратуюць, ды і жыццё людзей кардынальна не палепшаць, нават на мясцовым узроўні. Глыбока перакананы ў тым, што дасягненне ўстойлівасці развіцця рэгіёнаў патрабуе новага, адэкватнага сучасным патрабаванням, комплекснага падыходу, у цэнтры якога павінен быць чалавек, яго якасць жыцця. Вобразна кажучы, якасць жыцця — гэта той фокус, у якім знаходзяць сваё выяўленне і эканоміка, і палітыка, і ідэалогія. Не трэба выдумляць ніякіх новых падыходаў па вызначэнні эфектыўнасці СУР, дастаткова кваліфікавана падысці да ацэнкі якасці жыцця насельніцтва рэгіёнаў рознай велічыні. Мяркую, не лішнім будзе нагадаць азначэнне (маё ўласнае) гэтага адносна новага тэрміна для нашай навукі і практыкі. Гэта задаволенасць ці незадаволенасць насельніцтва сваім жыццём з пункту погляду розных патрэбаў і інтарэсаў, тых знешніх ўмовы існавання, у якіх знаходзіцца насельніцтва і якія робяць адбітак на яго паводзіны, уплываюць на яго жыццяздольнасць і ў канчатковым выніку — на працягласць жыцця. Якасць жыцця мае два бакі: аб'ектыўны (яго ацэнка абапіраецца на розныя колькасныя і якасныя паказчыкі) і суб'ектыўны (у аснове яго ацэнкі — стаўленне людзей да іх уласнай жыццядзейнасці, тых ці іншых яе праяўленняў і ўмоў, у якіх яна працякае).

Здзіўляе, што толькі цяпер, на дваццатым годзе ў аўтараў праекта ўзнікла неабходнасць у методыцы для вызначэння эфектыўнасці СУР. Можна прыдумляць самыя розныя методыкі і займацца навукатворствам, аднак, ці дапаможа гэта вырашыць праблемы з занятасцю насельніцтва, ростам заработнай платы, забяспечанасцю жыллём і добраўпарадкаваннем. Сёння найважнейшая задача — процідзейнічаць наступствам дэпапуляцыі, асабліва ў сельскай мясцовасці. Штогод насельніцтва краіны змяншаецца на 15—20 тысяч чалавек.


МС ІМІДЖ 28 снежня 2018 г. 15

МАНІТОРЫНГ І АЦЭНКА МЯСЦОВЫХ СТРАТЭГІЙ УСТОЙЛІВАГА РАЗВІЦЦЯ

У такой кампактнай краіне, як Беларусь, з яе адносна высокай шчыльнасцю дарожнай сеткі і адносна раўнамерным размеркаваннем буйных прамысловых цэнтраў, адным з галоўных кірункаў паспяховага сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў павінна стаць міграцыя насельніцтва і перамяшчэнне прадпрымальніцтва з мэтай скарачэння адлегласці да рынкаў. Менавіта на гэту акалічнасць звярталі ўвагу аўтары даклада аб сусветным развіцці за 2009 год: «Рост гарадоў, міграцыя насельніцтва і гандаль сталі каталізатарамі прагрэсу ў развітых краінах за апошнія два стагоддзі». Гэта значыць, што для тых раёнаў і населеных пунктаў, якія маюць трывалы дэмаграфічны патэнцыял, але характарызуюцца праблемамі занятасці насельніцтва, маятнікавая міграцыя магла б стаць шляхам частковага яе вырашэння. Аднак галоўнай застаецца палітыка дзяржавы, якая стварае ўмовы для росту вытворчасці ў такіх раёнах.

Важнае месца ў вырашэнні рэгіянальных праблем павінна заняць аптымізацыя адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення краіны. Размова ідзе не толькі аб ліквідацыі раёнаў з нязначным дэмаграфічным патэнцыялам, аб'яднанні тых ці іншых адміністрацыйных утварэнняў, але і аб скарачэнні колькасці дзяржаўных служачых і сродкаў на іх утрыманне на ўсіх узроўнях кіравання. Ненармальнай выглядае сітуацыя, калі ў шматлікіх адміністрацыйных раёнах Беларусі колькасць занятых у органах кіравання значна пераўзыходзіць колькасць занятых у рэальным сектары эканомікі.

Такім чынам, належыць яшчэ шмат зрабіць для таго, каб аслабіць неапраўдана высокую рэгіянальную дыферэнцыяцыю ў якасці жыцця насельніцтва. А стратэгіі ўстойлівага развіцця на мясцовым узроўні ў сённяшнім выглядзе — слабая дапамога ў гэтай складанай справе.

**З павагай і ўдзячнасцю, кандыдат геаграфічных навук, дацэнт Вячаслаў Мікалаевіч САСНОЎСКІ.**


**УРИЦКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ГОМЕЛЬСКОГО РАЙОНА**
**6 февраля 2019 года в 15.30 проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома**

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка,га | Инженерная инфраструктура | Начальная цена земельного участка (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы по подготовке руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Гомельский район, Урицкий сельсовет аг. Урицкое,Объездная, 1 (участок № 43 по генплану) | 321089602101000754 | 0,1500 | Электроснабжение,водопровод, гравийно-щебёночная дорога, участок свободен от застройки | 15 975,95 | 1597,60 | 1374,52 + расходы на размещение информации в СМИ |
| 2 | Гомельский район, Урицкий сельсовет, п. Борок, ул. Братьев Кричевцовых, 91Б | 321089600601000131 | 0,1300 | Электроснабжение,водопровод, гравийно-щебёночная дорога, участок свободен от застройки | 6 263,3 | 626,33 | 1312,62 + расходы на размещение информации в СМИ |

**Аукцион состоится по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, 51А, малый зал (3-й этаж) Гомельского райисполкома 6.02.2019 в 15.30.**

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток в размере, порядке и срок, определенные в извещении.

**Документы необходимые для участия в аукционе:**

Заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка.

Документ,подтверждающий внесение суммы задатка (на расчетный счет с отметкой банка).

Гражданином-копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

Представителем гражданина –нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан-документ, удостоверяющий личность.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае земельный участок предоставляется в частную собственность, при его согласии, с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 %).

Внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, осуществляются в установленном порядке победителем аукциона или единственным участником аукциона в течении 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протоколов о результатах аукциона.

*Задаток за участие в аукционе перечисляется на расчетный счет № BY75AKBB36414142300373100000 Урицкого сельского исполнительного комитета, № 302 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гомель, ул. Барыкина, 94, БИК AKBBBY21302, УНП 400178472, код платежа – 04901.*

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: Гомельский район, агрогородок Урицкое, ул. Ятченко Н. Г, 3. Урицкий сельский исполнительный комитет с даты опубликования извещения **по 31.01.2019 года** с 9.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00.

Все желающие могут ознакомиться с документацией в Урицком сельском исполнительном комитете. Контактные телефоны: (80232) 922-401, 922-404, +375 29 1397339 (МТС).



**РУП «Институт недвижимости и оценки» (организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Доломит» (продавец)**

**Лот № 1.** Силосный склад цеха № 2, инв. № 200/С-96175, площадь – 1588,2 кв. м., г. п. – 1967. Адрес: Витебская обл., г. Витебск, ул. Центральная, 25/31.

**Начальная цена – 286 252,80, бел. руб. с НДС.**
**Задаток – 30 000,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Земельный участок:** 240155400001000020, неделимый (письмо Витебского городского исполнительного комитета от 17.10.2018 № 994-01-02-17), долевое пользование. Переход права на долю земельного участка осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Размер штрафа, в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609, составляет 40 000,00 белорусских рублей.

**Аукцион состоится 24.01.2019 в 11.00 по адресу:**
**г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Доломит», проводимом 24.01.2019 г. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д.11, 3 этаж, каб. 7. Окончание приема заявлений: 22.01.2019 в 11.00. Контактное лицо для осмотра Объекта: Григорьев Владимир Александрович, тел. 8 (033) 398-08-88. Первое, полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 21.11.2018

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**



**ЗАСО «Промтрансинвест» предлагает принять участие в процедуре закупки № 2019-653808,** размещенной на сайте http://www.icetrade.by, по «Целлюлозно-бумажное производство > Бумага для офиса».

УНП 100357923

ЗАПРАШАЛЬНІК

# Калядны баль-маскарад

**У Мірскім замку ўжо заўтра, 12 студзеня, адбудзецца адна з самых яркіх і шыкоўных імпрэз зімы: сапраўдны баль-маскарад у стылі XVIII стагоддзя!**



А з чым у вас узнікае асацыяцыя адносна балю-маскараду? З загадкавасцю і таямнічасцю, лёгкай рамантыкай, старажытнасцю ці ашаламляльнай стракатасцю жаночых сукенак ды масак?

Як паведаміў **дырэктар музея «Замкавы комплекс «Мір» Алесь ЛОЙКА**, усё гэта — таямнічыя маскі, шыкоўныя строі і жывая музыка — не толькі створыць асаблівую атмасферу, але і дазволіць апынуцца на незвычайным свяце! Баль у Мірскім замку можна будзе лічыць свайго рода месцам, дзе сыходзяцца паралелі часу і мінулае ажывае...

Арганізатары падрыхтавалі для гасцей танцавальныя майстар-класы, прыемныя неспадзяванкі і фуршэт. А яшчэ звяртаюць увагу на неабходнасць выканання дрэс-коду: дамы запрашаюцца ў доўгіх сукенках (пажадана ў стылі XVIII стагоддзя), абутку без абцасаў, кавалеры — у строгіх касцюмах. І, безумоўна, не трэба забывацца аб галоўным атрыбуце свята — масках!

**Што?** Калядны баль-маскарад.
**Дзе?** Карэліцкі раён Гродзенскай вобласці, музей «Замкавы комплекс «Мір».
**Калі?** 12 студзеня, пачатак а 19-й гадзіне.

# Дзень снегу...

**Адзначаць у суботу, 12 студзеня, у Ляхавічах на стадыёне «Колас».**



www.lves.by

Зранку тут стартуе лыжная эстафета сярод прадстаўнікоў працоўных калектываў раёна, пасля якой пройдуць раённыя спаборніцтвы па біятлоне, эстафета сямейных камандаў і масавыя старты. Да вечара ўсе ахвотныя змогуць пакатацца са снежнай горкі і на лядовым катку. Дарэчы, за пракат спартыўнага інвентару грошай не возьмуць — усё бясплатна! Малых жа запрашаюць да ўдзелу ў гульнявой праграме «Снежная казка».

## ...і рыцарскі турнір

Але гэта не ўсе цікавінкі суботняга дня ў Ляхавічах: у спартыўнай зале СДЮШАР пройдзе рэспубліканскі турнір па рыцарскіх баях. Пачатак а 12-й гадзіне.

**Што?** Дзень снегу.
**Дзе?** Горад Ляхавічы Брэсцкай вобласці, стадыён «Колас».
**Калі?** 12 студзеня, пачатак — 10.30.

# «Як на Шчодрую куццю»

**У Пінску запрашаюць на народныя гулянні ў нядзелю, 13 студзеня. Свята адбудзецца на плошчы Леніна ў райцэнтры.**

Як паведамляюць арганізатары, апоўдні ўсіх, хто прыйдзе на свята, пачастуюць любімымі стравамі беларускай кухні, каляднымі прысмакамі ды Шчодрай куццёй. Далей па вуліцы Першамайскай пройдзе каляднае шэсце, а затым гасцей чакае гульнявая праграма: «Калядная забаўлянкі» і «Калядны батл» найлепшых фальклорных калектываў Пінска і раёна.

**Што?** Народныя гулянні «Як на Шчодрую куццю».
**Дзе?** Горад Пінск Брэсцкай вобласці, плошча Леніна.
**Калі?** 13 студзеня, пачатак а 13-й гадзіне.

ПРЫЁМ ГРАМАДЗЯН

# У ДЗЕЛАВЫМ СТЫЛІ

**Першы сёлета рабочы візіт у Ляхавіцкі раён для дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Леаніда Цупрыка быў па-дзеламу насычаным. Традыцыйна прыём грамадзян па асабістых пытаннях парламентарый праводзіў сумесна са старшынёй раённага Савета дэпутатаў Леанідам Калбасам.**



www.lves.by

Пяць зваротаў паказалі даволі шырокую тэматыку праблем, якія хвалююць людзей, паведамляе раённая газета «Ляхавіцкі веснік». Напрыклад, узнімаліся пытанні, якія датычыліся закрыцця Зубелевіцкага сельскага клуба, добраўпарадкавання вуліцы Першамайская у райцэнтры, праблемы спажывецкага кааператыва «Сучасны дом». Адным з заяўнікаў была агучана прапанова па новым парадку аплаты дарожнага збору, што цяпер вынесены на грамадскае абмеркаванне.

Леанід Цупрык уважліва выслухаў усіх, хто звярнуўся да яго са сваімі пытаннямі і праблемамі. Па некаторых з іх адразу былі дадзены тлумачэнні. Частка зваротаў патрабуе дадатковага вывучэння. Член парламента і старшыня раённага Савета дэпутатаў у найбліжэйшы час удакладняць пэўныя акалічнасці і нюансы, звязаныя з магчымасцю вырашэння ўзнятых праблем.

Што датычыцца культурнага жыцця ў вёсцы Зубелевічы, то, як запэўніў начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама Алег Трацяк, плануецца, што вяскоўцы змогуць карыстацца будынкам клуба для арганізацыі вольнага часу і адпачынку. Тут будуць праводзіцца як мерапрыемствы, наладжаныя сельскай бібліятэкай, так і выязныя. Адным словам, было б жаданне — а магчымасці застанецца.

СІТУАЦЫЯ

# ПАСАЖЫРСКІЯ ПЕРАВОЗКІ: ЖЫХАРЫ VS АЎТАПАРК

## Напрыканцы года ў сацсетках паўстала пытанне аб рабоце пасажырскага аўтатранспарту ў Драгічыне.

**Як паведамляе раённая газета «Драгічынскі веснік», у прыватнасці, жыхары мікрараёна Хлебазавод і крамы «Санта» скардзіліся на тое, што раніцай, калі многія дабіраюцца на вучобу і работу, грамадскі транспарт раз-пораз спазняецца, да таго ж не ўсе наогул маюць магчымасць змясціцца ў аўтобусах. Былі таксама нараканні з боку жыхароў іншых вуліц райцэнтра.**

— Стаім на прыпынку па 200 чалавек ледзьве не кожную раніцу. Калі прыходзіць аўтобус, то ён набіваецца так, што едзем, як селядцы ў бочцы. Да таго ж не ва ўсіх атрымліваецца наогул з'ехаць — многія, у тым ліку і дзеці школьнага ўзросту, так і застаюцца на прыпынку. Даводзіцца шукаць альтэрнатыўныя спосабы, як дабрацца на вучобу ці на работу — прасіцца ў машыну да суседзяў, знаёмых, — прыкладна такія словы выказалі абураныя жыхары той часткі горада.

У тыя ж дні скаргі на работу грамадскага аўтатранспарту сталі з'яўляцца і з боку насельніцтва мікрараёна Стараселле. Па словах мясцовых жыхароў, людзей, якія жадаюць дабрацца ў цэнтр горада, там шмат, а вось аўтобус падводзіць. Шмат хто стаіць на прыпынку, а транспарту ўсё няма і няма.

Вось што, у сваю чаргу, растлумачыў **дырэктар філіяла «Аўтамабільны парк № 15 г. Драгічына» Уладзімір МАЗОЛЬ**:

— Людзей з хлебазавода, якія жадаюць скарыстацца паслугамі грамадскага транспарту, сапраўды шмат, але і аўтобусаў дастаткова. Раніцай праз гэтую частку горада праходзіць 5 аўтобусаў. Тыя, хто не змог трапіць у першы, садзяцца ў другі, трэці і гэтак далей. Усе маюць магчымасць з'ехаць і своечасова дабрацца да месца вучобы, работы (апошні з гэтых пяці аўтобусаў прыбывае на прыпынак у 7.30), — адказаў кіраўнік транспартнай арганізацыі. — Праблема ў тым, што гараджане ў першую чаргу садзяцца ў прыгарадны аўтобус, праезд у якім каштуе танней (35 капеек ад хлебазавода да аўтастанцыі), чым у аўтобусе гарадскіх маршрутаў (60 капеек). Таму і ўзнікае сітуацыя, калі аўтобусы па прыгарадных маршрутах, якія маюць меншую ўмяшчальнасць, бітком забітыя, а гарадскія (МАЗ-103 — адны з самых вялікіх, што ёсць у нас, умяшчальнасцю да 100 чалавек) цалкам не запаўняюцца. У сувязі з гэтым намі і было прынята рашэнне з 1 студзеня 2019 года зраўняць кошт праезду на прыгарадных і гарадскіх маршрутах.

Таксама суразмоўнік дадаў, што ў тыя дні, калі з'явіліся скаргі ад гараджан, былі снегапады, не ўсе дарогі своечасова расчышчаліся ад снегу, і, магчыма, з гэтай прычыны былі нязначныя спазненні грамадскага транспарту — у тым ліку і па мікрараёне Стараселле.

— Мы імкнёмся рэагаваць на кожны зварот жыхароў горада і раёна па пытаннях курсіравання пасажырскага аўтатранспарту, часта саступаем у плане ўнясення змяненняў у маршруты, час руху, аж да некалькіх хвілін, — дадаў ён.

Прадставіўшы ўвазе чытачоў абедзве пазіцыі, раённая газета паабяцала ў найбліжэйшы час глыбей вывучыць сітуацыю і праехацца па асобных маршрутах руху пасажырскага аўтатранспарту як у горадзе, так і за яго межамі.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 10 студзеня 2019 года.**